

ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ ПРЫРОДНЫЯ БАГАЦЦІ 4

ВЫБУХ У ЗАБАЛАЦІ МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 чэрвеня 2024 г.
СЕРАДА
№ 108 (30242)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ШВАЮНОЎ, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Паняцце якасці будаўніцтва шматграннае. Гэта і якасць матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца ў будаўнічым працэсе, гэта і якасць праектавання: які будзе праект, такі будзе і аб'ект. Вядома ж, размова аб якасці вытворчасці саміх работ. Мы павінны разглядаць гэты аспект праз эфектыўную сістэму вытворчага кантролю. І, у рэшце рэшт, гэта якасць падрыхтоўкі спецыялістаў будаўнічай галіны. У тым ліку праз распрацоўку прафесійных стандартаў, на падставе якіх укараняюцца адукацыйныя праграмы, каб мы маглі атрымаць кампетэнтных спецыялістаў».*

## КОРАТКА

- **Нацыянальны аэрапорт Мінск прызнаны найлепшым у СНД па выніках 2023 года.**
- Беларусь і Каралеўства Эсваціні ўстанавілі дыпламатычныя адносіны.
- **За навучальны год «Карта навучэнца» ахапіла 853 школы і 96 тысяч школьнікаў краіны.**
- У Башкартастане ў белавежскіх зуброў нарадзілася першае дзіцяня.
- **Мінпрам: Беларусь гатова забяспечваць уласныя патрэбы практычна па ўсіх сельгасмашынах.**
- Дні Мінска пройдуць на ВДНГ у Маскве з 7 да 28 чэрвеня.

Падзея

# Чым уражвае «Белагра-2024»

### З кожным годам усё больш удзельнікаў, а разнастайнасць экспазіцый пашыраецца




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.





**З 4 да 9 чэрвеня можна азнаёміцца з дасягненнямі ў развіцці раслінаводства, жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі, сучаснымі тэхналогіямі перапрацоўкі, упакоўкі і захоўвання прадукцыі, а таксама разнастайнасцю сельгастэхнікі на новай пляцоўцы ў выставачным цэнтры Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі Камень».**

Дарэчы, падчас урачыстага адкрыцця аграпрамысловай выставы **першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей ФЕДЧАНКА** заявіў, што «Белагра» — унікальная пляцоўка, на якой дэманструюцца дасягненні беларускага аграпрамысловага комплексу за апошнія гады.

У АПК зроблена многае, адзначыў Сяргей Федчанка: «Мы практычна на 100 % забяспечваем харчовую бяспеку Беларусі, займаем 97-е месца ў свеце па колькасці насельніцтва і 84-е — па тэрыторыі. У той жа час наша краіна ўваходзіць у пяцёрку экспарцёраў малочных прадуктаў, у топ-15 экспарцёраў мяса і мясапрадуктаў. Наша краіна ў сусветных лідарах па вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў на душу насельніцтва. Такія вынікі забяспечаны пры падтрымцы дзяржавы і дзякуючы асабістай увазе Прэзідэнта. Нельга забываць і пра ўпартую работу аграрыяў. Акрамя таго, нам дапамагалі Міністэрства прамысловасці, навукоўцы і спецыялісты НАН Беларусі».

Рухацца наперад без навукі немагчыма ні ў адной галіне, тым больш у сельскай гаспадарцы. «Цяпер на «Белагра» дэманструецца ўсё тое, што выкарыстоўваецца ў нас на палях і фермах. Таксама паказваем распрацоўкі, якія будуць у перспектыве выкарыстаныя ў АПК для папулярызацыі беларускай прадукцыі і ў цэлым сельскай гаспадаркі», — падкрэсліў Сяргей Федчанка.

Ён дадаў, што, дзякуючы намаганням Міністэрства прамысловасці, Беларусь можа цалкам адмовіцца ад імпарту сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання, каб перайсці на сваё. «Сёння нам прапаноўваецца поўны набор машын і механізмаў для таго, каб рабіць усё тэхналагічна ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі», — заявіў першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання.

Па яго словах, пытанне дакладнага земляробства яшчэ ў пачатку шляху. У будучыні прагназуецца мінімальнае выкарыстанне людской працы і эканомія рэсурсаў, якія цяпер выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы.

«Прэм'ер-міністр агучыў, што харчовая бяспека Беларусі складае 94 %. Астатнія 6 % прыпадаюць на тыя культуры, якія ў нас не растуць. Напрыклад, бананы і мандарыны. Пры гэтым малака мы вырабляем у 2,5 раза больш, чым спажываем, цукру — у 2 разы.

СТАР. 3

По сутнасці справы

# ПЛЯЖНЫ СЕЗОН АДКРЫТЫ

**Мора — справа добрая, але яно — сапраўднае — далёка і не заўсёды даступнае. Між тым адпачынак каля вады незаменны — ён дазваляе і расслабіцца, і падцягнуць фізічную форму, і загартавацца, і атрымаць такі патрэбны нам усім вітамін D. Не трэба забываць пра асалоду, якую дорыць вада і прыбярэжная прырода, а таксама — пра непаўторную атмасферу для зносін з блізкімі. Усё гэта цалкам магчыма ў Беларусі. У нашай краіне больш за 20 тысяч рэк і каля 11 тысяч азёр. Дастаткова і пляжаў — утульных, бяспечных, пад наглядам ратавальнікаў і праваахоўнікаў. Важна толькі і нам самім быць асцярожнымі, уважлівымі, культурнымі карыстальнікамі рэкрэацыйных зон, дзе б яны ні знаходзіліся. І тады адпачынак абавязкова атрымаецца якасны і бяспечны. Пра тое, як падрыхтаваліся да купальнага сезона рэгіёны нашай краіны, чытайце ў артыкулах уласных карэспандэнтаў «Звязды».**



СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X
24108
9 771990 763008


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# З УЛАН-БАТАРА — У ІРКУЦК

**Азіяцкая паездка Прэзідэнта Беларусі працягваецца. Учора, пасля завяршэння дзяржаўнага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Манголію, борт нумар адзін узяў курс на расійскі Іркуцк.**

Пасля прыбыцця ў расійскі рэгіён кіраўніка беларускай дзяржавы каля трапа самалёта сустракалі паўнамоцны прадстаўнік Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў Сібірскай федэральнай акрузе Анатоль Серышаў, губернатар Іркуцкай вобласці Ігар Кобзеў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Дзмітрый Крутой і іншыя афіцыйныя асобы.

Беларусь і Іркуцкая вобласць маюць даўнія і трывалыя ўзаемаадносіны ў самых розных сферах. Гэты расійскі рэгіён для Беларусі даўні і важны партнёр як у гандлі, так і ў інвестыцыйнай і культурнай сферах.

Як вядома, Беларусь і Расія асаблівую ўвагу ўдзяляюць развіццю ўласнага авіябудавання. Перад расійскай авіябудаўнічай галіной стаіць задача рэалізаваць маштабныя праекты па нарошчванні аб'ёмаў выпуску суднаў грамадзянскай авіяцыі. Прадпрыемствы Беларусі даўно падключыліся да рэалізацыі гэтай задачы, яны дапамагаюць з пастаўкамі авіяцыйных кампанентаў, вузлоў і агрэгатаў.

Сярод іншых сфер узаемадзеяння — лясная гаспадарка і будаўніцтва. Акрамя таго, для Іркуцкай вобласці могуць уяўляць цікавасць беларускае гарна-шахтавае абсталяванне і кар'ерная тэхніка, грузавыя аўтамабілі, пасажырскі транспарт.

А ў завяршальны дзень візіту ў Манголію лідары дзвюх краін камунікавалі ў нефармальнай абстаноўцы. Кіраўнік беларускай дзяржавы наведаў загарадны Цэнтр мангольскай культуры, дзе азнаёміўся з самабытнымі традыцыямі і звычаямі народа Манголіі.

У гонар высокага госця з Беларусі для кіраўнікоў дзяржаў аднавілі атмасферу мангольскага агульнанацыянальнага фестывалю Наадам, які штогод праводзіцца ў ліпені і падчас якога вакальныя і харэаграфічныя нумары дэманструюцца ўперамешку з традыцыйнымі мангольскімі відамі спорту. Аляксандру Лукашэнку прапанавалі апрабаваць традыцыйны мангольскі лук для стральбы. Ужо з першага стрэлу страла паляцела на больш як 75 метраў.

Прэзідэнт Беларусі падарыў свайму мангольскаму калегу Ухнаагійн Хурэлсуху два трактары «Беларус» на 80 і на 200 конскіх сіл. А Ухнаагійн Хурэлсух падарыў Аляксандру Лукашэнку пару мангольскіх скакуноў буланай масці. Ім ужо далі мянушкі: Мір і Хуткі.

**Паводле БелТА.**

Эканоміка

# Стабільнасць, устойлівасць і прадказальнасць

## Кіраўнікі ўрадаў краін ЕАЭС падпісалі пакет дакументаў па выніках пасяджэння Еўразійскага міжурадавага савета ў Нясвіжы

**Сярод дакументаў — распараджэнне «Аб гадавой справаздачы Еўразійскай эканамічнай камісіі аб стане канкурэнцыі на трансгранічных рынках і мерах, якія прымаюцца па спыненні парушэнняў агульных правілаў канкурэнцыі на іх, за 2023 год». Таксама адобрана распараджэнне «Аб дакладзе за 2023 год «Аб стварэнні і развіцці транспартнай інфраструктуры на тэрыторыях дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў напрамках Усход — Захад і Поўнач — Поўдзень, у тым ліку ў рамках спалучэння з кітайскай ініцыятывай «Адзін пояс, адзін шлях».**

У ЕАЭС пачалася рэалізацыя пілотнага праекта па ўкараненні электроннага мытнага транзіту па маршрутах Достык — Брэст-Паўночны і Алтынколь — Брэст-Паўночны. У фінальнай стадыі падрыхтоўкі знаходзіцца дамоўленасці па лічбавізацыі грузавых чыгуначных перавозак паміж Расіяй і Кітаем. Яшчэ адно прынятае распараджэнне — «Аб маніторынгу правядзення ацэнкі рэгулявальнага ўздзеяння праектаў рашэнняў Еўразійскай эканамічнай камісіі ў 2023 годзе».

Як адзначыў падчас пасяджэння Еўразійскага міжурадавага савета **прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА,** важным складнікам нацыянальнага механізму ЕАЭС з'яўляецца адзіная мытная прастора. «У цэнтры сённяшняга парадку дня — праблематыка дакладнасці мытнага кошту тавараў, які дэкларуецца, — удакладніў ён. — Гэта пытанне непасрэдна закранае эканамічныя інтарэсы нашых краін. Пытанне дастаткова адчувальнае, важна, што мы ўсе ўсведамляем неабходнасць прыняцця дадатковых рэгулятыўных рашэнняў у гэтым кірунку».

Раман Галоўчанка звярнуў увагу на тое, што сустрэча праходзіць у знакавы момант. Ён нагадаў, што нядаўна, 29 мая, адзначаўся 10-гадовы юбілей Еўразійскага эканамічнага саюза, што, безумоўна, мае на ўвазе падвядзенне вынікаў і фарміраванне планаў на будучыню. «Стабільнасць, устойлівасць і прадказальнасць развіцця саюза — гэта вынік зладжанай працы, якая стала магчымай дзякуючы спалучэнню патэнцыялаў эканомік нашых краін, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — Наша супрацоўніцтва пабудавана на раўнапраўнай аснове, улічвае інтарэсы кожнай дзяржавы незалежна ад маштабаў і структуры эканомікі, пераадольвае любыя выклікі: ці то пандэмія, ці то эканамічная трансфармацыя, выкліканая геапалітычнай турбулентнасцю».

Краіны ЕАЭС падышлі да юбілейнай даты з добрымі эканамічнымі паказчыкамі. «За 10 гадоў ВУП саюза ў супастаўных цэнах павялічыўся больш як на 12 % і па выніках мінулага года ацэньваецца ў $2,4 трлн, — канкрэтызаваў кіраўнік беларускага ўрада. — Рэальны ўзровень грашовых даходаў хатніх гаспадарак у большасці дзяржаў — членаў ЕАЭС павысіўся за гэтыя гады. Развіваецца ўзаемны гандаль, які вырас за мінулы год яшчэ на 4,7 %. Прычым за дзесяцігоддзе аб'ём тавараабароту практычна падвоіўся. У агульным аб'ёме ўзаемнага гандлю ўдзельная вага кааперацыйных тавараў склала 35 %. Саюз стаў паўнапраўным суб'ектам міжнароднага права і працягвае набіраць вагу на сусветнай арэне. Пашыраецца геаграфія міжнародных сувязяў і кантактаў з дзяржавамі Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, Блізкага Усходу, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі».

Найважнейшым індыкатарам эфектыўнасці еўразійскай інтэграцыі Раман Галоўчанка назваў вырашэнне пытанняў харчовай бяспекі. Учора мы шмат гаварылі аб гэтым на адпаведнай пленарнай сесіі. Па яго словах, неабходна кансалідаваць намаганні для зніжэння тэхналагічных і тэхнічных праломаў у нашай харчовай бяспецы, што цяжка зрабіць без дзяржаўнай падтрымкі. Прэм'ер-міністр таксама адзначыў, што цяпер Беларусь паставіла пытанне аб пераносе тэрмінаў прыняцця абавязацельстваў у галіне дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі. «Сістэма падтрымкі аграрнай галіны ў многім дала магчымасць нашай краіне захаваць вёску, яе вытворчы і сацыяльны патэнцыял. Разлічваем, што нашы партнёры падтрымаюць ініцыятыву аб пралангацыі дзеючага памеру дзяржпадтрымкі вёскі. Асабліва з улікам таго санкцыйнага ціску, які аказваецца на нашу краіну», — сказаў ён.

Раман Галоўчанка лічыць, што важна працягваць развіццё лічбавых інструментаў рэалізацыі чатырох свабод. «Перакананы, што прыйшоў час паставіць кропку і канчаткова вырашыць пытанне з узаемным прызнаннем электроннага лічбавага подпісу, — падкрэсліў ён. — Гэта тэма, на наш погляд, відавочнаераспела, прамаруджванне з яе вырашэннем будзе азначаць магчымасць эрозіі інтэграцыйных працэсаў у саюзе. Далей рухацца проста немагчыма. Але, алічбоўваючы тыя ці іншыя працэсы, мы не павінны забываць і аб абавязацельствах па прадастаўленні пастаўшчыкам з краін саюза нацыянальнага рэжыму».

На яго думку, трэба пачаць з акрэдытацыі органаў па сертыфікацыі, выпрабавальных лабараторый, якія даюць права на выпуск тавараў у свабоднае абарачэнне.

«Падчас нашых сустрэч мы аднагалосна робім акцэнт на прынцыповай важнасці работы па міжнародным пазіцыянаванні саюза і стварэнні дадатковых умоў для доступу тавараў ЕАЭС на замежныя рынкі праз заключэнне пагадненняў аб стварэнні зон свабоднага гандлю з трэцімі краінамі, — звярнуў увагу кіраўнік урада. — Пры гэтым, нягледзячы на пэўныя поспехі, развіццё некаторых перагаворных трэкаў прытармазілася. Мяркую, што прыйшоў час больш крытычна паглядзець на сітуацыю дзяржавам, гатовым з намі ўзаемавыгадна супрацоўнічаць». На думку беларускага боку, патрэбна паскарэнне па тых напрамках, дзе ёсць добры тэмп. Гэта Інданезія, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты і Манголія.

Кіраўнік беларускага ўрада таксама адзначыў, што краіны ЕАЭС выйшлі на фінальную стадыю рэалізацыі стратэгічных напрамкаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года. «Пазітыўныя вынікі відавочныя па мностве запланаваных мерапрыемстваў. Пры гэтым шэраг мерапрыемстваў яшчэ ў стадыі прапрацоўкі і ёсць апасенні, што яны не будуць выкананы да канца 2025 года (з-за пралангацыі тэрмінаў, адсутнасці кансэнсусу і гэтак далей). Разам з тым стратэгічныя кірункі развіцця — гэта дакумент, зацверджаны кіраўнікамі дзяржаў, і наша задача — забяспечыць яго поўнае выкананне», — рэзюмаваў Раман Галоўчанка.

**Паводле БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Клаўдыя Шэйнбаум аб'явіла аб перамозе на прэзідэнцкіх выбарах у Мексіцы



Мексіканскі кліматолаг і былы мэр Мехіка, кандыдат ад кааліцыі «Працягнем разам ствараць гісторыю» Шэйнбаум адсвяткавала сваю перамогу на прэзідэнцкіх выбарах, паведаміла «Сіньхуа». Яна выступіла з прамовай пасля таго, як Нацыянальны выбарчы інстытут апублікаваў папярэднія вынікі галасавання, паводле якіх яна набрала ад 58,3 да 60,7 працэнта галасоў. 61-гадовая Клаўдыя Шэйнбаум стане першай жанчынай-Прэзідэнтам Мексікі за больш чым 200 гадоў незалежнасці краіны. Кандыдат ад апазіцыйнага альянсу «Сіла і сэрца за Мексіку» Сочытль Гальвес набрала ад 26,6 да 28,6 працэнта галасоў і прызнала сваё паражэнне. Адзіны кандыдат-мужчына Хорхе Альварэс Майнес ад Грамадзянскага руху набраў ад 9,9 да 10,8 працэнта галасоў.

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Клаўдыю Шэйнбаум з выбраннем на пасаду Прэзідэнта Мексікі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы пацвердзіў зацікаўленасць у наданні большай дынамікі беларуска-мексіканскаму ўзаемадзеянню. «Перакананы, сумеснымі намаганнямі мы зможам рэалізаваць існуючы значны патэнцыял супрацоўніцтва нашых краін», — падкрэсліў Прэзідэнт.***

## Кааліцыя прэм'ера Модзі атрымала большасць месцаў у парламенце Індыі




Нацыянальны дэмакратычны альянс (НДА) на чале з Індыйскай народнай партыяй («Бхарата джаната парты») прэм'ер-міністра Нарэндры Модзі атрымаў больш за палову месцаў у ніжняй палаце парламента Індыі па выніках выбараў. Аб гэтым сведчаць афіцыйныя вынікі падліку галасоў, апублікаваныя тэлеканалам NDTV па меры паступлення інфармацыі з выбарчых акруг, паведаміла ТАСС. Паводле апошніх даных, кааліцыя Модзі атрымала каля 290 месцаў у ніжняй палаце парламента, якая налічвае 543 крэслы. Цяпер апрацаваны галасы выбаршчыкаў, якія пададзены па пошце. Зацвярджаюцца галасы, атрыманыя пры дапамозе электронных машын для галасавання. Паведамляецца, што апазіцыйная кааліцыя INDIA, якая ўключае 28 партый, можа разлічваць прыкладна на 220 месцаў. Цяпер Модзі зможа трэці раз запар заняць пасаду прэм'ера краіны. Усеагульныя парламенцкія выбары праводзіліся ў Індыі з 19 красавіка. Галасаванне праходзіла ў сем этапаў. Усяго было зарэгістравана 968 мільёнаў выбаршчыкаў.

## Самалі запатрабавала ад Эфіопіі вывесці яе войскі са сваёй тэрыторыі



Урад Самалі запатрабаваў ад Эфіопіі вывесці свае войскі з самалійскай тэрыторыі да канца года. Пра гэта паведаміў самалійскі партал GAROWE са спасылкай на саветніка прэзідэнта Самалі па нацыянальнай бяспецы Хусэйна Мааліма. Да такога рашэння прывяло значнае пагаршэнне двухбаковых адносін, адзначае партал. Да таго ж размова ідзе аб намеры Магадзіша ўмацаваць свой суверэнітэт і ўзмацніць кантроль над вырашэннем праблем унутранай бяспекі. Войскі Эфіопіі разам з кантынгентамі некаторых іншых краін Афрыкі былі ўведзены ў Самалі ў 2005 годзе па просьбе ўрада гэтай краіны для аказання дапамогі ў стабілізацыі абстаноўкі і для барацьбы з тэрарыстычнай арганізацыяй «Аш-Шабаб». Становішча карэнным чынам змянілася.

# Чым уражвае «Белагра-2024»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




Выстава набыла статус міжнароднай. У гэтым годзе ў ёй удзельнічаюць і дэманструюць свае дасягненні кампаніі з 11 краін. «Будзе і дзелавая праграма, падчас якой плануецца абмеркаваць пытанні селекцыі, насенняводства, племянной жывёлагадоўлі, землябробства, аграрнай адукацыі і навукі. Сама выстава традыцыйна напоўнена рознымі прэзентацыямі, аглядамі, конкурсамі, культурна-масавымі і спартыўнымі мерапрыемствамі. Упэўнены, выстава сёлета пацвердзіць свой высокі статус дэманстрацыйнай пляцоўкі для аграрыяў», — лічыць першы намеснік міністра.



## Што пабачым і што купім?

Усіх, хто як-небудзь мае дачыненне да сельскай гаспадаркі, цікавіць, што новага з'яўляецца на рынку і над чым працуюць інжынеры-машынабудаўнікі: якія новыя тэхналогіі прымяняюцца ўжо сёння і чаго чакаць заўтра; што сёння яшчэ з'яўляецца ідэяй і што мы ўжо ў найбліжэйшы час убачым у новай сельгастэхніцы? На ўсе гэтыя пытанні можна знайсці адказ, наведаўшы менавіта «Белагра».

Шырока прадстаўлены на выставе ўгнаенні і сродкі абароны раслін, тэхніка для ўнясення ўгнаенняў, для ўборкі збожжавых і нарыхтоўкі кармоў, машыны для меліярацыйных работ, вырошчвання і ўборкі бульбы, цукровых буракоў і іншай гароднiны. Сельскагаспадарчая прадукцыя, машыны, абсталяванне дэманструюцца ў тэхналагічным ланцужку з сучаснымі энергазберагальнымі тэхналогіямі ўсіх галін, звязанымі як з вытворчасцю прадукцыі, так і з яе перапрацоўкай, транспарціроўкай, захоўваннем і рэалізацыяй.

Экспазіцыя выставы «Белферма» дэманструе апошнія дасягненні ў галіне жывёлагадоўлі, кармушкі для жывёл і абсталяванне для іх утрымання, клеткавае абсталяванне і інкубатары, аўтаматызаваныя ўстаноўкі для малочнатаварных ферм. На выставе таксама можна пазнаёміцца з аўтаматызаванай сістэмай кіравання статкам; даільнымі ўстаноўкамі розных мадыфікацый; малакоахаладжальнымі ўстаноўкамі, як стацыянарнымі, так і перасоўнымі для работы на пашах. Тут паказваюць новыя кармы і кармавыя дабаўкі, ветэрынарныя прэпараты і медыкаменты, новыя тэхналогіі ў біяэнергетыцы, у тым ліку энергетычнае абсталяванне і яго праграмнае забеспячэнне.

Штогод вялікую цікавасць як у спецыялістаў, так і ў маленькіх наведвальнікаў выставы выклікае «Рыбацкая вёска», арганізаваная ГА «Белводгас». Каля 150 беларускіх вытворцаў прадставілі шырокі спектр прадуктаў харчавання: каўбасныя вырабы, мясныя паўфабрыкаты, птушка, малочная прадукцыя, кансерваваныя прадукты, бакалея, дзіцячае і дыетычнае харчаванне, хлебабулачныя вырабы і многае іншае. Прадпрыемствы харчпрама радуюць наведвальнікаў выставы дэгустацыямі сваёй прадукцыі.

Асобную экспазіцыю на адкрытай пляцоўцы фарміруюць вытворцы агародніннай прадукцыі. Наведвальнікі выставы атрымалі магчымасць не толькі азнаёміцца з новымі сартамі агародніны, вырашчанымі ў нашай краіне, але і набыць іх.

У дні выставы пройдуць усенародны дэгустацыйны конкурс «Чэмпіён смаку», «Конкурс на найлепшую племянную карову», конкурс «Найлепшы племянны конь», конкурс «Найлепшы араты», выстава сельскагаспадарчых жывёл, дэманстрацыйныя паказы тэхнікі і іншыя мерапрыемствы.

Па традыцыі акцэнт зроблены на інавацыях «Белагра-2024». Разам з традыцыйнымі экспанатамі будуць прадэманстраваны інавацыйныя прадукты, перадавыя рашэнні і тэхналогіі.

Не застанецца па-за ўвагай наведвальнікаў «Гандлёвы гарадок», які ўяўляе сабой своеасаблівую выставу дасягненняў харчовай прамысловасці і кірмаш-продаж прадуктаў харчавання. Госці гандлёвага гарадка «Белагра-2024» набудуць найлепшыя прадукты, якія выпускаюцца айчыннымі прадпрыемствамі харчовай прамысловасці.

Аграрны форум традыцыйна збірае разам не толькі беларускіх аграрыяў і работнікаў харчовай і перапрацоўчай прамысловасці, але і іх замежных калег ды партнёраў. Сёлета ўдзел у выставе прымаюць 490 кампаній з Беларусі, Расіі, Кыргызстана, Казахстана, Манголіі, Германіі, Кітая, Пакістана, Турцыі, В'етнама, Палесціны. У дзелавой праграме — каля 20 тэматычных канферэнцый і семінараў.

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

**У тэму**

***Каментарый ад намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Андрэя БАЛЫША.***

На думку дэпутата, «Белагра» сёння — больш чым уласна выстава, гэта ўвесь спектр сучасных і перадавых тэхналогій у жывёлагадоўлі і раслінаводстве, якія закранае ўвесь аграпрамысловы комплекс нашай краіны. «Дзякуючы ўзважанай палітыцы лідара нашай дзяржавы і яго пастаяннай падтрымцы работнікаў вёскі, санкцыі з боку недружалюбных краін істотна не ўплываюць на далейшае развіццё нашага аграпрамысловага комплексу».

Дадзены форум з'яўляецца адкрытай пляцоўкай для дэманстрацыі перадавых дасягненняў у жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі, ветэрынарыі, сельскагаспадарчай тэхнікі не толькі для беларускіх аграрыяў і работнікаў харчовай, перапрацоўчай прамысловасці, але і для замежных калег.

Наша краіна займае лідарскія пазіцыі па малаку. І сапраўды, Беларусь з'яўляецца пятай дзяржавай у свеце па экспарце малочнай прадукцыі на душу насельніцтва. Падлічана, што сумарны экспартны патэнцыял усёй прадукцыі сельскай гаспадаркі перавышае дзевяць мільярдаў долараў у эквіваленце.

Андрэй Балыш адзначыў, што ў кожнай вобласці вядуцца распрацоўкі па будаўніцтве новых, сучасных, рабатызаваных малочнатаварных комплексаў. На такіх «суперфермах», дзякуючы круглагадоваму ўтрыманню жывёл у камфортных умовах з ужываннем штучнага інтэлекту, праца ў жывёлагадоўлі становіцца значна менш цяжкай і больш жаданай.

У нашай краіне ёсць такія гіганты, як «Гомсельмаш», МТЗ, «Бабруйскаграмаш» і іншыя, якія вядомыя не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. «Насуперак санкцыям, мы здолелі максімальна мабілізавацца. І забеспечыць харчовую бяспеку краіны, цяпер вырашаецца задача аб павелічэнні экспартнага патэнцыялу нашай краіны».





# ІМЯ, НАПІСАНАЕ НА НЯБЁСАХ

## 5 чэрвеня — дзень памяці прападобнай Ефрасінні Полацкай

**Сёння мы адзначаем дзень памяці святой апякункі Беларусі, прападобнай Ефрасінні Полацкай. Адусюль прыязджаюць у гэты дзень паломнікі ў Полацкі Спаса-Ефрасінеўскі манастыр, заснаваны полацкай княжной, што абрала служэнне Госпаду, а не забавы свецкага жыцця. Свята сёлета адметнае і тым, што ў наступным годзе манастыр святкуе 900 гадоў ад заснавання. Уражальная даўніна! І ўражальная постаць прападобнай Ефрасінні... Давайце ўспомнім некалькі фактаў пра святую апякунку зямлі Беларускай.**

### З Полацка — у Іерусалім, з Іерусаліма — у Полацак

Гэтымі днямі асабліва шмат паломнікаў будуць падыходзіць да цудатворных мошчаў святой Ефрасінні... Якая памерла далёка ад радзімы, падчас паломніцтва ў Іерусалім, 5 чэрвеня 1173 года. Дарэчы, адзіны раз за ўсю гісторыю, насуперак традыцыі, для паломніцы былі адкрыты Залатыя Вароты Іерусаліма — гэтай паломніцай была прападобная Ефрасіння. Смерць на Святой Зямлі яна ўспрымала як вялікі гонар. Месца яе спачыну было ў манастыры Феадосія Вялікага, каля Іерусаліма. У 1187 годзе горад захапіў султан Салах-ад-Дзін. Уцякаючы, хрысціяне вывезлі і нятленныя мошчы прападобнай Ефрасінні, якія апынуліся ў Дальніх пячорах Кіева-Пячэрскай лаўры.

Хадайніцтвы аб вяртанні мошчаў прападобнай на яе радзіму пачаліся ў 1832 годзе, 77 гадоў разглядаў іх Святы Сінод. Станоўчая рэзалюцыя была зроблена імператарам Мікалаем II 3 ліпеня 1909 года. А ўрачыстае перанясенне пачалося 19 красавіка 1910 года. Калі параход «Галавачоў» з рэліквіяй плыў па Дняпры, на берагах стаялі на каленях людзі з запаленымі свечкамі. З тагачасных рэпартажаў вядома, што нават вада з хваляў ад парахода лічылася лекавай, яе збіралі ў бутэлькі, прамывалі ёю вочы. Параход спыняўся ў Рэчыцы, Жлобіне, Рагачове, Быхаве, Магілёве. Вуліцы там упрыгожвалі сцягамі, гірляндамі, дыванамі, кветкамі. У адным толькі Рагачове да мошчаў святой падышло 50 тысяч чалавек, у Магілёве — 75 тысяч, у Оршы — 40 тысяч. Прычым ад Оршы да Полацка праз Віцебск раку з мошчамі неслі на руках. Заняло гэта цэлы месяц. У Полацк святыня прыбыла 20 мая. А 23-га мошчы паклалі ў адмысловую срэбную раку Спаса-Праабражэнскага сабора. Так што нятленныя мошчы прападобнай перанесеныя ў заснаваны ёю манастыр менавіта ў дзень яе спачыну — 23 мая па новым стылі і ёсць 5 чэрвеня. Сёння яны знаходзяцца ў Крыжаўзвіжанскім саборы на тэрыторыі манастыра.

### Сёстры і пляменніцы прападобнай

Кажуць, прападобная Ефрасіння мела такі дар духоўны, што «на каго пазірала вачыма сваімі, адразу даведвалася, ці ёсць у ім дух дабрадзейнасці ці можа ён быць умяшчальняй, абранай для Госпада». Таму не толькі сама абрала шлях служэння Богу, але і прывяла на яго сваіх сясцёр і пляменніц.

Гардзіслава была малодшай сястрой Ефрасінні. Менавіта яе абрала святая, калі трэба было шукаць памагатых. Яна прыехала ў манастыр і неўзабаве ўжо была манашкай з хрысціянскім імем Еўдакія. Як адрэагавалі бацькі? Летапіс захаваў іх гаротныя словы: «Ці для таго мы нарадзілі вас, каб вы ў гэтых чорных рызах пасяліліся ў манастыры і пазбавілі нас тых уцех, якіх мы чакалі ад вас?» Малодшая сястра стала найлепшай вучаніцай асветніцы, потым — яе памочніцай. У манастыры на Еўдакіі ляжалі гаспадарчыя справы. А Звеніслава была стрыечнай сястрой Ефрасінні, дачкой князя Барыса, старэйшага брата князя Святаслава. Ефрасіння была для яе прыкладам. Пасаг Звеніслава аддала манастыру, сказаўшы: «Уся прыгажосць гэтага свету мне не патрэбна». Ефрасіння выбрала для стрыечнай сястры, якая стала манашкай, імя Еўпраксія. І былі яны «як адна душа ў двух целах». Еўпраксія кіравала перапісваннем кніг, вяла заняткі ў заснаванай Ефрасінняй школе для дзяўчынак. Суправаджала старэйшую сястру падчас падарожжа ў Іерусалім да Гроба Гасподняга...

Наколькі святая ігумення валодала сэрцамі, паказвае факт: калі да яе прыехаў пагасцяваць брат Вячаслаў з сям'ёй, Ефрасіння проста аб'явіла, што дзвюх пляменніц, Кірынію і Вольгу, пакідае ў манастыры. Бацькі горка плакалі, але не асмеліліся пярэчыць, і іх дачкі праз нейкі час сталі манашкамі.

### Незвычайная эрудыцыя святой апякункі

Святая Ефрасіння, безумоўна, была адной з самых дасведчаных і адукаваных асоб сваёй эпохі. Ілюстрацыяй якраз глыбокіх ведаў з'яўляюцца і фрэскі XII стагоддзя, зробленыя па яе замове ў Спаса-Праабражэнскім саборы. Сярод іх ёсць прысвечаная Антонію Вялікаму, які шукае Паўла Фівейскага на Сінайскім паўвостраве. Святы не мог знайсці дарогу, ён памаліўся, і яму з'явіўся кентаўр, які і правёў яго да Паўла. Многіх, хто бачыць роспіс з кентаўрам у праваслаўнай царкве, гэта здзіўляе і бянтэжыць. Багасловы тлумачаць сюжэт так: калі чалавек сапраўды верыць, яму служаць усе сілы. Як сведчаць навукоўцы, гэты сюжэт у XII стагоддзі быў вядомы толькі на двух мовах: арабскай і латыні. Так што можаце ўявіць узровень адукацыі прападобнай Ефрасінні. Недарэмна з ёй гутарылі і вялі перапіску самыя вядомыя мысляры яе часу.

Шмат гістарычных таямніц яшчэ намі не раскрыта, не асэнсавана культурнае багацце, якое пакінулі нашы продкі, у тым ліку святая прападобная Ефрасіння. Няхай жа яна па-ранейшаму апякуецца нашай зямлёй.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ**

З нагоды

Сяргей МАСЛЯК:

# «У БЕЛАРУСІ ЁСЦЬ УСЁ, КАБ ЯНА БЫЛА САМАДАСТАТКОВАЙ»

**Напярэдадні Дня аховы навакольнага асяроддзя, які адзначаецца сёння, паразмаўлялі з міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргеем Міхайлавічам МАСЛЯКОМ.**


Фота Віктара ДРАЧОВА.

***— Сяргей Міхайлавіч, прыродаахоўная тэматыка вам не новая. У вашым актыве — профільная вышэйшая адукацыя, работа ў лясніцтве, інжынерам у «Белдзіпралесе», кіраўніком «Зеленбуда» Заводскага раёна сталіцы, старшынёй Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. А цяпер пасада міністра. Гэта і прызнанне папярэдніх заслуг, і ў той жа час зусім іншы ўзровень адказнасці і спектр задач.***

— Жыццё — пастаяннае развіццё, імкненне да самаўдасканалення. Не ў маіх правілах адмаўляцца ад новых ведаў і магчымасці зрабіць нешта карыснае для сваёй краіны, людзей, якія жывуць на нашай зямлі, зрабіць унёсак у абарону навакольнага асяроддзя. Калісьці перада мной стаяў выбар, у які ўніверсітэт паступаць: фізкультурны або тэхналагічны (лесагаспадарчы факультэт). Я спыніўся на апошнім, паколькі гэтая справа здавалася мне таямнічай, нязведанай і разам з тым вабіла сваёй прыгажосцю.

Новая пасада — вялікая адказнасць і перад людзьмі, і перад Прэзідэнтам. Але ў той жа час гэта цудоўная магчымасць павысіць якасць жыцця нашых грамадзян, захаваць і прымножыць прыродныя багацці, забяспечыць камфортнае і здаровае навакольнае асяроддзе для цяперашняга і наступных пакаленняў.

***— Пры вашым назначэнні кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на задачах, якія стаяць перад Мінпрыроды. Яны шмат у чым звязаны з геалагічнай галіной краіны. Як плануеце выбудаваць работу ў гэтым кірунку?***

— Перш за ўсё хацелася б выказаць шчырую падзяку маім папярэднікам, якія ўклалі шмат сіл у развіццё прыродаахоўнай галіны. Мая задача — працягнуць і давесці да паспяховага завяршэння ўсе іх пачынанні і праекты.

Для выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы, у прыватнасці выключэння неабгрунтаванага імпарту сыравіны, у першую чаргу неабходна праводзіць аналіз і інтэнсіфікацыю мінеральна-сыравіннай базы краіны. Так, мною ўжо былі здзейснены працоўныя візіты ў Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі, яго філіялы ў Мазыры і Слуцку. Абмяркоўваліся такія пытанні, як выкананне ўстаноўленых паказчыкаў у справаздачным перыядзе і планах на бягучы год, перспектывы развіцця геалагічнай галіны.

Сёння на тэрыторыі нашай краіны выяўлена больш за 50 відаў карысных выкапняў (калійныя солі, пяскі, гліна, мел, нафта і інш.), звыш 14 тысяч радовішчаў. Але існуючы патэнцыял задзейнічаны не ў поўнай меры. Задача на найбліжэйшую перспектыву — нарошчванне магутнасцяў здабычы ўласных рэсурсаў, што дасць магчымасць забяспечыць эканамічную бяспеку краіны і знізіць яе імпартазалежнасць ад іншых дзяржаў. Уцягванне ў распрацоўку новых радовішчаў, павелічэнне вытворчага патэнцыялу ўжо дзейных і адкрыццё новых прадпрыемстваў будзе садзейнічаць вытворчасці новых відаў прадуктаў і пашырэнню іх асартыменту. У Беларусі ёсць усё, каб яна была самадастатковай.

Будзе актывізавана работа ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва. У першую чаргу будуць прадоўжаны і пашыраны дзелавыя кантакты з Кітайскай Народнай Рэспублікай і Расійскай Федэрацыяй, у тым ліку па абмене вопытам, сучаснымі інавацыйнымі распрацоўкамі і тэхналогіямі ў горназдабыўной галіне. Узяўшы на ўзбраенне правераную часам практыку — айчынную і замежных партнёраў, можна хутчэй дасягнуць жаданых вынікаў.

***— Візіткай нашай краіны з'яўляюцца чысціня і парадак. Прэзідэнт неаднаразова падкрэсліваў важнасць прадаўжэння работы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, у прыватнасці неабходнасць азелянення адхонаў дарог.***

— Міністэрства прыродных рэсурсаў выступае каардынатарам плана мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі. Азеляненне адхонаў уздоўж МКАД, магістральных трас рэспубліканскага і гарадскога значэння — сапраўды надзённае пытанне. Сумесна з вучонымі з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі мы павінны максімальна адпрацаваць магчымыя варыянты азелянення асноўных магістраляў і даць мясцовым органам улады адпаведныя рэкамендацыі. Таксама неабходна прыняць меры па навядзенні парод, якія ўстойлівыя да рэагентаў і не патрабуюць асаблівага догляду.

Акрамя таго, немалаважным з'яўляецца як захаванне тэхналогіі пасадкі маладых дрэў і кустоў, так і далейшы догляд высаджаных раслін: іх паліў, падкорм, абарона ад хвароб і шкоднікаў і інш. Дарэчы, сёлета тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды будзе ўзмоцнены кантроль у галіне аховы і выкарыстання раслiннага свету.

***— Якім аспектам работы міністэрства неабходна, на ваш погляд, удзяляць асаблівую ўвагу?***

— Трэба ўзмацніць інфармаванне насельніцтва аб дзейнасці сістэмы Мінпрыроды: яе рэсурсах, магчымасцях, дасягненнях, ахове навакольнага асяроддзя. Трэба асвятляць работу розных падведамных арганізацый, знаёміць са спецыфікай паўсядзённай работы метэаролагаў, геолагаў, эколагаў-інжынераў і іншых спецыялістаў, расказваць аб ходзе навуковых даследаванняў і гэтак далей. Заахвочваецца крэатыўны падыход, напрыклад, стварэнне азнаямленчых відэаролікаў аб аб'ектах здабычы карысных выкапняў, маніторынгу якасці вады, унікальных помніках прыроды. У нас павінен быць эксклюзіўны кантэнт, і я думаю, што мы ім у поўнай меры валодаем.


Канстанціна БАЛАШОВА

Прадстаўленне інфармацыі насельніцтву ў даступнай і зразумелай форме садзейнічае ўцягненню грамадскасці ў пытанні экалагізацыі жыцця ў цэлым і эканомікі ў прыватнасці, матывуе на ўдзел у экалагічных ініцыятывах і вырашэнні розных праблем навакольнага асяроддзя.

***— Тое, што ад асобы кіраўніка залежыць калі не ўсё, то вельмі шмат, ведаюць усе. У той жа час адзін чалавек не можа быць спецыялістам ва ўсіх сферах і без каманды прафесіяналаў не абысціся. Якому прынцыпу фарміравання каманды аддаяце перавагу вы?***

— Для мяне галоўнае ў чалавеку — яго прафесіяналізм, адказнасць, працавітасць, прыстойнасць. Павінна быць дысцыпліна, дакладнае выкананне пастаўленых задач і даручэнняў. Я прывык так працаваць, так вучылі мае настаўнікі, людзі старой загартоўкі. Зразумела, ёсць розныя сітуацыі ў жыцці, але ёсць абавязковасць: паабяцаў — выканай. Заахвочваю ініцыятыву, крэатыўнасць і імкненне генерыраваць ідэі, прапаноўваць рашэнні складаных задач. Для мяне таксама важнае жаданне работнікаў вучыцца, набываць досвед.

Кадры — гэта ключавая каштоўнасць для любой арганізацыі, яе галоўны актыў. Наша ведамства чакае самая сур'ёзная работа як у цэнтральным апараце, так і на месцах. Ад зладжанасці калектыву, яго прафесіяналізму залежыць поспех агульнай справы.

**Александрына ПАРШЫНА.**

Прыёмная кампанія — 2024

# УМОВЫ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ ПАВІННЫ БЫЦЬ КАМФОРТНЫЯ

## Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід МАРТЫНЮК пракантраляваў ход правядзення цэнтралізаванага тэсціравання

**У Магілёўскай вобласці ў здачы прадметаў па цэнтралізаваным тэсціраванні прымаюць удзел 6228 чалавек. Іспыты праходзяць на базе сямі ўстаноў. У панядзелак у Беларускім дзяржуніверсітэце харчовых і хімічных тэхналогій ЦТ па матэматыцы здавалі 58 юнакоў і дзяўчат. Як адзначыў рэктар ВНУ Максім КІРКОР, шмат хто з іх перад гэтым спрабаваў тут свае сілы ў рэпетыцыйным тэсціраванні.**

— Моладзь, якая прыходзіць на ЦТ, нервуецца. Ад выніку залежыць далейшы лёс, — кажа рэктар ВНУ. — Мы імкнёмся засцерагчы іх ад непрыемнасцяў, стварылі глебу, каб яны прадэманстравалі свае веды. ЦТ праводзіцца ў краіне болей чым 10 гадоў, вопыт набыты каласальны, і людзі, якія працуюць у аўдыторыях, маюць вялікі досвед. Да таго ж была магчымасць праверыць свае сілы ў набліжанай да ЦТ абстаноўцы — паўдзельнічаць у рэпетыцыйным тэсціраванні. Гэта вельмі карысна: рэпетыцыйнае тэсціраванне вельмі дапамагае пераадолець стрэс.



Пракантраляваць ход правядзення ЦТ ва ўніверсітэт завітаў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Мартынюк.

— Задача абласной камісіі — забяспечыць камфорныя ўмовы для таго, каб гэта мерапрыемства прайшло псіхалагічна лёгка для яго ўдзельнікаў, — адзначыў ён. — Прадугледжана ўсё, пачынаючы ад падвозу, заканчваючы стварэннем мікраклімату ў аўдыторыях.



Любы экзамен — гэта пэўная стрэсавая сітуацыя, якую малады чалавек пераадольвае, каб атрымаць вынік, які будзе карыстацца ў жыцці. Прыйшоўшы на іспыт, ён ужо мяркуе, куды пойдзе далей. І трэба зрабіць так, каб нічога не пашкодзіла яму цалкам раскрыцца.

Леанід Мартынюк паведаміў, што кантроль за правядзеннем ЦТ робіцца з мэтай выключэння розных негатыўных момантаў і праверкі ўмоў для тых, хто ў ім удзельнічае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з сайта mogilevnews.by.**

# ПЛЯЖНЫ СЕЗОН АКРЫТЫ

## Найлепшы адпачынак — бяспечны

**Вось і лета прыйшло... Людзі — і гараджане, і вяскоўцы — пацягнуліся да вады. І ад таго, якое мы выбіраем месца для купання, часта залежыць, наколькі якасным, але, галоўнае, бяспечным будзе наш адпачынак.**

Паводле аператыўных даных, з пачатку 2024 года ў краіне патанулі 103 чалавек, трое з іх — непаўналетнія. Аб падрыхтоўцы пляжаў Міншчыны да купальнага сезона і асноўных правілах бяспекі карэспандэнту «Звязды» расказаў **старшыня Мінскай абласной арганізацыі Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах Сяргей ПАТРЫКЕЕЎ.**

***— Сяргей Аляксеевіч, наколькі гатовыя месцы масавага адпачынку цэнтральнага рэгіёна да пляжнага сезона?***

— На тэрыторыі Мінскай вобласці рашэннямі раённых выканаўчых камітэтаў вызначана 109 зон масавага адпачынку. Да 1 мая раённыя і гарадскія выканкамы праводзілі абследаванні рэкрэацыйных зон на ўзбярэжжах водных аб'ектаў, вызначалі іх прыдатнасць для бяспечнага баўлення часу. Гэта і вадалазныя абследаванні, і кантроль санэпідэмслужбаў, і наяўнасць інфраструктуры. На падставе гэтых праверак пляжу выдаецца тэхнічны пашпарт.

Па стане на 1 мая не ўсе пляжы былі гатовыя да масавага адпачынку. Часцяком віной — падтапленні. Цяпер вада сыходзіць, але ёсць некалькі месцаў, у якіх пакуль што нельга адпачываць. Напрыклад, Войкаўскае вадасховішча Лагойскага раёна.

У першыя дні лета на Міншчыне працягваецца добраўпарадкаванне зон масавага адпачынку. Для камфортнага і бяспечнага знаходжання людзей на пляжах усталёўваюцца ценявыя навесы, кабінкі для пераапранання. Таксама абсталяваны месцы для купання дзяцей да 9 гадоў і ад 9 да 14 гадоў уключна — спецыяльныя агароджы, якія не дазволяць дзіцяці выйсці за межы бяспечнай для купання зоны. Ніколі не будзе лішнім нагадаць, што ў любым выпадку неабходны пільны кантроль дарослых.

У дазволеных для купання месцах дзяжурыць ратавальная служба, супрацоўнікі МУС ахоўваюць правапарадак. Калі ў такіх месцах патрабуецца дапамога, яна неадкладна аказваецца. Дарэчы, ратавальнікі могуць прымяняць экстранныя меры. У іх ёсць 10 хвілін, каб выцягнуць тапельца. Знаходжанне пад вадой больш чым 10 хвілін, як правіла, прыводзіць да смяротнага зыходу.

***— Як правільна аказаць першую дапамогу пры ўтапленні?***

— У першую чаргу чалавека неабходна выняць з вады. Затым пакласці яго на роўную паверхню, пад плечы падкласці мяккі прадмет для таго, каб можна было задраць галаву. Пасля гэтага неабходна рабіць сардэчна-лёгачную рэанімацыю. Ёсць пэўная методыка выканання рэанімацыі, мы навучаем гэтаму сваіх супрацоўнікаў, трэніруемся аказваць першую дапамогу на спецыяльных манекенах. Калі масаж сэрца і штучная вентыляцыя лёгкіх ажыццяўляюцца правільна і своечасова, гэта велізарны поспех на шляху вяртання чалавека да жыцця. У любым выпадку неабходна выклікаць хуткую дапамогу. Ёсць такі варыянт развіцця падзей, як другаснае ўтапленне — у выніку ацёку лёгкіх.

Але большасць выпадкаў утаплення фіксуецца ў тых месцах, дзе ратавальнікаў няма. Самая частая прычына трагедый — купанне ў стане алкагольнага ап'янення.

Выпадкаў гібелі людзей на водных аб'ектах, дзе дзяжураць нашы ратавальнікі, не было ўжо больш за 10 гадоў. Дзякуючы Прэзідэнту Беларусі ўмовы для дзейнасці нашай арганізацыі значна палепшыліся, актыўна абнаўляецца матэрыяльна-тэхнічная база. Наша вадалазна-ратавальная служба выконвае асноўную задачу па ахове і ратаванні людзей. Мы маем сучаснае плавальныя сродкі, вадалазнае абсталяванне, водна-маторную тэхніку.

***— Якія пляжы найбольш прывабныя для жыхароў цэнтральнага рэгіёна? Што можаце параіць нашым чытачам?***

— Найбольш папулярныя сярод насельніцтва пляжы знаходзяцца каля буйных водных аб'ектаў, напрыклад возера Нарач, возера Мястра ў Мядзеле, самае буйное штучнае Вілейскае вадасховішча. Найбольшая наведвальнасць пляжаў зарэгістравана ў раённых цэнтрах. Самы прыгожы пляж, які прызнаны найлепшым за 2023 год, — пляж горада Жодзіна. Барысаў па рацэ Бярэзіне мае прыгожыя і, што важна, бяспечныя пляжы. Дарэчы, усе 109 пляжаў Міншчыны абсталяваны, абследаваны і маюць пашпарты.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**



Цэнтральны пляж горада Барысаў.

Фота Мінскай абласной арганізацыі АСВОД.

## У маляўнічай мясціне

**Рэканструкцыю папулярнай зоны адпачынку Чырвоны двор правялі ў Брэсце. На паўднёва-ўсходняй ускраіне горада ёсць вялікі штучны вадаём. Побач з ім з даўніх часоў улетку адпачывалі гараджане. Возера знаходзіцца фактычна пасярод сасновага лесу, мясціна даволі прывабная. Людзі выбіраюцца сюды сем'ямі, сяброўскімі кампаніямі: і побач з горадам, і на прыродзе. Але акрамя сонца і вады, жоўтага пяску на беразе ды прыгожага валуна, побач з якім рабілі сэлфі, тут фактычна нічога не было.**

І вось з пачатку гэтай вясны ў зону адпачынку прыйшлі будаўнікі. Найперш яны ўзяліся за дарогі і пад'езды да вадаёма. Пад'язную дарогу ад картынгавага стадыёна, што знаходзіцца побач, да возера пакрылі асфальтам, а дарогу вакол вадаёма — асфальтабетонам. Работу праводзіла камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Брэсцкае ДЭП». **Намеснік дырэктара прадпрыемства Эдвард СЫРЭВІЧ** адзначыў, што пачыналі з санітарнай ачысткі і прыборкі тэрыторыі, потым правялі ладны аб'ём работ па абмежаванні несанкцыянаваных заездаў на пляж з боку лясных сцяжын. Цяпер сюды можна заехаць толькі па дарозе, якая вядзе з горада.

— Устанавілі дарожны борт, тратуарны борт. Далей узяліся за пракладку водаправода і электрычных сетак. Вада патрэбна як для ўстаноўкі душавых кабін, так і для гандлёвых павільёнаў, пад якія адведзены пляцоўкі, — працягвае Эдвард Часлававіч. — Для функцыянавання гандлёвых пунктаў, як вядома, неабходна электрычнасць. Таксама ўстаноўлены дзве душавыя кабіны і два пітныя фантанчыкі. Ну а для актыўнага баўлення часу адпачывальнікаў зманціраваны спартыўны комплекс, дзіцячая гульнявая пляцоўка. Абсталяваны кабіны для пераапранання, бліжэй да вады ўстаноўлены ценявыя навесы і лежакі, — зроблена прыкладна так, як мы ўжо зрабілі на цэнтральным пляжы па вуліцы Набярэжнай Францыска Скарыны.

Спецыялісты ДЭП завезлі некалькі тон чыстага пяску з кар'ера, разраўнялі яго, пляж цяпер выглядае даволі прывабна. Цяпер сюды можна выбірацца сям'ёй хоць на цэлы дзень.

А ўсяго ў Брэсцкай вобласці на гэты год зацверджаны 102 месцы масавага адпачынку на вадаёмах. Паводле інфармацыі **старшыні абласной арганізацыі Таварыства ратавання на водах Віталя КУЛІНІЧА**, у 96 месцах дазволена купанне, а на астатніх шасці прадугледжаны адпачынак каля вады без права купання.

Сёлета ў вобласці дадаткова ўладкавалі два пляжы, дзе раней купацца было забаронена. Але ж гэтыя месцы традыцыйна карысталіся папулярнасцю і людзі туды ішлі. Напрыклад, у гарадскім пасёлку Дамачава Брэсцкага раёна ў спёку на возеры заўсёды збіралася многа адпачывальнікаў, як і на возеры Свяцілаўскім у Баранавічах. Цяпер пляжы там добраўпарадкавалі, на іх з'явіліся сезонныя пасты Таварыства ратавання на водах.

Напярэдадні купальнага сезона вадалазы абследавалі акваторыі вадаёмаў, ачысцілі іх ад смецця і лішняй расліннасці. Работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі прыбралі пляжы, правялі, дзе трэба, рамонтныя работы. Застаецца толькі самім адпачывальнікам паводзіць сябе культурна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Гайда на рэчку!

**На Магілёўшчыне для купання прадугледжана 61 месца адпачынку. У Магілёве такіх месцаў пяць: Грабянёўскае і Пячэрскае вадасховішчы, гарадскі пляж на рацэ Днепр, а таксама месцы адпачынку на заліве Дняпра ў раёне вуліц Фаціна і Златаўстоўскага і на сажалцы пасёлка Брады. Згодна з планам падрыхтоўкі гэтых месцаў да летняга сезона, асноўныя работы па навядзенні парадку павінны былі быць завершаны да 1 мая.**

Даты крыху перасунула вялікая вада, якая сёння трымалася практычна ўвесь май. Але работы, па словах спецыялістаў, вяліся, і, як толькі вадаёмы вярнуліся ў свае берагі, месцы адразу ж акультурваліся.

— У нас на прадпрыемстве ёсць будаўнічая брыгада, якая зімой робіць пляжнае абсталяванне, рамантуе яго, абнаўляе, — расказала **начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела «Магілёўзелянбуд» Святлана БАНКУЗАВА.** — Сёлета, напрыклад, 200 новых лежакоў зрабілі. Старыя ўжо адпрацавалі свой рэсурс, практычна на ўсіх пляжах устанавілі новыя. На пляжах на Пячэрскам возеры, у раёне вуліцы Фаціна і на Брадах паставілі новыя альтанкі і раздзявальні. Наогул, на апошніх двух пляжах асабліва часта даводзіцца мяняць і рамантаваць абсталяванне. Людзі не вельмі беражліва ставяцца да грамадскай маёмасці. Асабліва на Брадах. Летась там за адну ноч практычна ўсе лежакі і альтанкі спалілі. Мы звярнуліся ў міліцыю, але вінаватых не знайшлі. Штогод лежакі ламаюць, паляць у вогнішчы або выкідваюць у вадаём. Некалькі разоў выцягвалі лежакі з вады. Невядома, навошта толькі людзі гэта робяць? Плаваць спрабуюць на іх ці што?

Аб'ёмы работ сапраўды ўражваюць. Згодна з планам «Магілёўзелянбуда», сёлета трэба было зрабіць рамонт і ўстаноўку 52 ценявых навесаў і сонцаахоўных грыбкоў, адрамантаваць і ўстанавіць 30 раздзявальняў, 14 біяпрыбіральняў, некалькі дзесяткаў кантэйнераў для цвёрдых бытавых адходаў, 250 лежакоў, 93 лаўкі, адрамантаваць 14 інфармацыйных стэндаў.

Акрамя гэтага, план патрабуе паклапаціцца пра месцы, дзе купанне забаронена. Усе сімпатычныя на выгляд пясчаныя беражкі ўздоўж ракі Днепр ад чыгуначнага моста да Рачнога порта, а таксама на Грабянёўскім і Пячэрскім вадасховішчах і сажалцы ў Брадах, якія афіцыйна не прызнаны месцамі для адпачынку, патэнцыяльна небяспечныя. Вельмі часта трагічныя выпадкі здараюцца ў такіх несанкцыянаваных месцах, як заліў ракі Днепр на вуліцах Шаўчэнкі, Соф'і Кавалеўскай, на вадаёмах каля завода «Тэхнапрыбор», у раёне вуліц Акцюбінскай, Першамайскай, Цішкі Гартнага, Праванабярэжнай, Ямніцкай, Льва Сапегі. На ўсёй рацэ Дубравенцы не прадугледжана купанне. Усяго «Магілёўзелянбуд» устанавіў сёлета 110 забаранялаьных стэндаў. Карысна ведаць, што ўсе стэнды і інфраструктура зроблены за наш з вамі кошт, то-бок за бюджэтныя сродкі.

Бюджэтныя грошы таксама пайшлі на рамонт 10 кантэйнерных пляцовак, абсталяванне васьмі месцаў для курэння. На Грабянёўскім і гарадскім пляжах падрыхтаваны тры месцы для развядзення вогнішча, а таксама тры купальні для дзяцей. На гарадскім пляжы купальня з'явіліся зусім нядаўна: камунальнікі чакалі, калі сыдзе вада.

Цяпер на пляжах прыгожа і ўтульна. Усё абсталяванне новае, афарбаванае. Прадпрыемства наваат пясок пачысціла. Дарэчы, яго наогул час ад часу ў такіх месцах мяняюць. Летась, напрыклад, завозілі на пляж у пасёлку Брады.

На ўсіх пяці пляжах працуюць супрацоўнікі Таварыства ратавання на водах.

У Магілёве функцыянуюць тры атавальныя станцыі і два ратавальныя пасты, удакладняе **старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае рэспубліканскае таварыства выратавання на водах» Канстанцін ІВАНОЎ.** У маштабах вобласці — 9 выратавальных станцый, 20 пастаянных выратавальных пастоў і 19 — сезонных. Вядзецца работа па падрыхтоўцы яшчэ некалькіх зон адпачынку ў Мсціслаўскім і Асіповіцкім раёнах.

— Вельмі хочацца, каб людзі больш сур'ёзна падыходзілі да выбару месца для адпачынку, — кажа суразмоўнік. — За купанне ў забароненым месцы прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу да трох базавых велічынь. Але гэта чыста сімвалічная сума, калі помніць, што пад пагрозу становіцца не столькі кашалёк, колькі жыццё.

Канстанцін Іваноў таксама нагадвае, што купанне дзяцей да 14 гадоў без суправаджэння дарослых забараняецца. Як і купанне ў начны час. Гэта прадугледжана Правіламі аховы жыцця людзей на водах, якія былі зацверджаны Саўмінам летась у жніўні.

Сёлета на Грабянёўскім возеры, якое ў народзе называюць Святым, чакаецца ажыўленне. Нагадаем, што некалькі гадоў запар санітарныя службы забаранялі ў ім купанне з-за няякасных паказчыкаў вады. У народзе казалі, што ва ўсім вінаватыя чайкі, калонія якіх акупавала плавучы востраў пасярод возера. Небяспеку ўяўляла тое, што востраў павялічваўся ў памерах і пагражаў экалагічнаму стану наваколля. Але на абласным і гарадскім узроўнях было вырашана востраў прыбраць і вярнуць папулярнае месца адпачынку гараджанам. Мерапрыемствы па прывядзенні ў якасны стан месца адпачынку раcлічаны не на адзін год. Але шмат работы ўжо зроблена. І вада, як адзначылі ў санслужбе, нармалізавалася.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Дзейныя асобы

# Паўстагоддзя каля крыніц мудрасці

## Людзей, якія ўсё жыццё сябруюць з кнігамі, у краіне многа, а вось якія працуюць...

**Ніна Астапаўна Нікіцюк акурат з такіх: у 1973-м скончыла Мінскі педінстытут, пераступіла парог Камянецкай раённай бібліятэкі і адразу адчула сябе як дома. Дружны быў калектыў, з такім нястрашна было праз два з паловай... месяцы пераходзіць на пасаду загадчыцы.**

— Страшна стала пазней, у 1977-м, — прыгадвае суразмоўца, — калі пачалася поўная перабудова нашай дзейнасці — аб'яднанне ўсіх бібліятэк раёна ў цэнтралізаваную сістэму. Даводзілася шмат ездзіць па раёне — дапамагаць, тлумачыць, весці семінары... Колькі розных выпадкаў здаралася! Помню, аднойчы за дзень шэсць кіламетраў прайшлі і на 12 спадарожных машынах пад'ехалі! Помню, як, згубіўшы ключы, залазілі ў бібліятэку праз акно, як, заблукаўшы, ледзь не выйшлі да пагранзаставы. А неяк (я толькі пачынала працаваць) у чытальнай зале з'явіўся мужчына, які папярэдзіў, што будзе прыходзіць штодня, бо хоча знайсці пэўную цытату Леніна. Ён збіраўся перагледзець усе 55 тамоў... Вось тут мне спатрэбіліся набытыя веды. Я ўзяла даведачны том, досыць хутка знайшла патрэбную кнігу і вынесла чытачу. Бачылі б вы, як чалавек здзівіўся!.. І мне было радасна: дапамагла.

Яшчэ і тым (прыгадваем разам), што ўдзвюх з пісьменніцай Святланай Курылёвай стварылі літаратурна-музычную гасцёўню, дзе збіралася мясцовая інтэлігенцыя, дзе абмяркоўваліся новыя раманы Ю. Бондарава, Н. Думбадзэ, В. Быкава, В. Распуціна, дзе прысутныя знаёміліся з творчасцю П. Чайкоўскага, Г. Свірыдава, М. Цвятаевай...



— Гэтыя гады былі самымі цікавымі, — успамінае Ніна Астапаўна.

Яна ж пасля выхаду на заслужаны адпачынак з радасцю прыняла прапанову настаяцеля Сімяонаўскага храма, протаіерэя Сергія Буркоўскага паклапаціцца пра царкоўную бібліятэку. Каб давесці ўсё да ладу, прыйшлося папрацаваць і там.

А ў вольны час мая суразмоўца (апроч таго, што чытае) глядзіць інтэлектуальныя тэлеперадачы, сябруе з інтэрнэтам, вяжа, вырошчвае кветкі і гародніну, дэкламуе вершы.

— Не раз, — узгадвае, — выступала ў ролі канферансье, удзельнічала ў конкурсах чытальнікаў. Найбольш люблю дэкламаваць «Зінку» Юліі Друнінай... Дарэчы, многім знаёмы яе кароткі верш: «Я столько раз видала рукопашный, // Раз наяву. И тысячу — во сне...»

Далей там толькі два радкі: «Кто говорит, что на войне не страшно, // Тот ничего не знает о войне». Усё. Кропка. І мала хто ведае, што ў гэтым вершы было 12 слупкоў. Перачытаўшы, паэтка пакінула адзін! Вось такая патрабавальнасць да сябе ў сапраўдных талентаў! Яны пакінулі нам сваю творчасць, свае кнігі — крыніцы мудрасці, ведаў, лекі для душы.

**Настасся Нарэйка,**
**фота аўтара.**

*г. Камянец.*

Перажытае — незабытае

# БЫЛІ ТАДЫ ЗДРАДНІКІ. І БЫЛІ ПАТРЫЁТЫ

**...На ўсход праз вёску Кашэвічы рухаліся нямецкія войскі. У Яўсевічах (так званым Малым сяле (Кашэвічы — гэта Вялікае...) была размешчана камендатура. Туды на рэгістрацыю, па загадзе каменданта, з усяго раёна ішлі мужчыны, і многія з іх дамоў ужо не вярталіся. Усіх савецкіх актывістаў, палонных чырвонаармейцаў і проста падазроных расстрэльвалі за царквой і могілкамі каля чыгуначнага насыпу. А напярэдне трымалі ў царкве,ператворанай у турму, не дазвалялі выходзіць нават па патрэбе. Сама кашэвіцкая царква, помнік драўлянага дойлідства (год пабудовы 1642!), была разрабавана.**

Алена Маставая жыла непадалёк ад храма і старалася не трапляць на вочы фашыстам, на гарод выходзіла толькі раніцай і пад вечар, днём ішла ў грыбы ці ягады.

Менавіта там, у лесе, яна сустрэла былога старшыню Кашэвіцкага сельсавета Яўхіма Зізюка, які ў патайным курані праведваў двух цяжка параненых вайскоўцаў.

На прапанову дапамагчы ў лячэнні Алена адразу ж згадзілася. Яна ведала толк у медыцынскай справе, а таму за некалькі тыдняў паставіла хлопцаў на ногі, завяла іх у вёску Доўгія Нівы ў партызанскі атрад Ціхана Бумажкова. І сама потым не раз бывала там.

...Халодным асеннім днём парог крайняй ад лесу хаты пераступіў паранены чырвонаармеец і адразу ж страціў прытомнасць. Гаспадыня марудзіць не стала — паклікала на дапамогу Алену. Жанчыны перавязалі раны і накармілі чалавека, а ноччу на насілках перанеслі яго ў надзейнае схавішча.

Раніцай у дзверы Алены хтосьці моцна пагрукаў. «Колькі тых жыхароў у вёсцы, але ж, бач ты, і сярод іх адшукаўся здраднік!» — здагадалася маладая гаспадыня.

Вобыск працягваўся доўга, але ў хаце нічога падазронага немцы не знайшлі. Затое ў хлеўчыку пад саломай заўважылі санітарныя насілкі. Алену арыштавалі, павялі ў камендатуру.

Допыты доўжыліся па некалькі гадзін і былі досыць частымі. «Дзе партызаны? Дзе параненыя салдаты?» — на ламанай рускай мове пытаў гітлераўскі афіцэр. Дзяўчына маўчала. Яна — шчырая вернiца — не хацела і не магла шкодзіць іншым людзям.

Фашысты білі яе. Калі траціла прытомнасць, аблівалі халоднай вадой,анач зачынялі ў халодным склепе, раніцай зноў пыталіся, дзе партызаны... Алена, ледзь жывая ад пабояў, па-ранейшаму шаптала: «Я нічога не ведаю!» — і хацела толькі аднаго: каб усё гэта скончылася. І як мага хутчэй.

Урэшце напаўголую, знявечаную, акрываўленую дзяўчыну павезлі ў бок могілак. Стаяць яна ўжо не магла: два здаравякі-фашысты трымалі яе пад рукі.

Туды ж, да чыгункі, немцы сагналі вяскоўцаў. Гледзячы на змардаваную Алену, усе яны плакалі, а нямецкі афіцэр казаў: «Ведайце: за сувязь з партызанамі так будзе з кожным!»

Толькі на трэці дзень, калі камендатура пераехала ў Капаткевічы, сваякі і суседзі пахавалі Алену на мясцовых могілках, непадалёк ад царквы. Пакутніцкую смерць прыняла зямлячка.

...У вёсцы Кашэвічы ёсць вуліца Маставая. Прозвішча такое насілі і носяць многія яе ўраджэнцы. Сярод іх — патрыётка Алена Несцераўна.

**Уладзімір Пугач,**
*Петрыкаўскі раён.*



Уражанні

# Прыгоды, цікавыя ўсім

**Аліса пакуль не прафесійная мастачка, яна толькі вучыцца, але адна яе карціна ўжо ўпрыгожвае сталічную кавярню, другая — «Цікаўны каток» — выстаўлена на віртуальнай сцяне прэстыжнага кніжнага кірмашу... А не так даўно ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы адкрылася першая персанальная выстаўка Алісы Ліпніцкай.**

Аліса займаецца музыкай, вельмі любіць майстраваць і чытаць, да многіх з прачытаных кніг прыдумвае свае ілюстрацыі: да «Прыгод ката-летуценніка», да «Льва па імені Ілай», да «Гары і папугая»... Такім чынам ідэі большасці твораў дзяўчынкі нарадзіліся менавіта ў бібліятэцы.

Там жа, на выстаўцы, работы Алісы змаглі па-новаму ўбачыць не родныя і сябры, аднакласнікі, юныя і дарослыя чытачы.

Працаваць гэтая выстава будзе да канца чэрвеня.

**Алена Савельева,**

*г. Мінск.*

Бацькі і дзеці

# ПРЫ ЖАДАННІ МОГ ЧАЛАВЕК ЗНАЙСЦІ РАБОТУ І ЖЫЦЬ, АЛЕ...

**Апошнім часам неяк часта даводзіцца чуць: «Ну вось — і добры ж быў мужчына, а такі нешчаслівы... Чаму?»**
**Колькі людзей, столькі меркаванняў. Паспрабую выказаць сваё.**

П'яніцамі, курцамі ды наркаманамі, асобамі з іншымі залежнасцямі і сапраўды не нараджаюцца, імі становяцца, прычым ва ўсіх на вачах. Калі пра гарэлку — то спачатку чарка-другая, пахмелле... А далей выпіўка становіцца нечым амаль паўсядзённым: з палучкі, з авансу, пад добры настрой і пад дрэнны, проста за кампанію. Не далучышся, — і ты ўжо як быццам не свой...

А самае крыўднае, што часта ў тых самых працоўных калектывах, рабочых інтэрнатах не знаходзіцца нікога, хто сказаў бы: «Кінь дурное... Гайда ў спартзалу, у кіно, у басейн...» Не маючы іншай кампаніі, малады чалавек далучаецца да той, што ёсць, і яму нават здаецца, што правільна робіць.

Помню, як горача адзін з маіх школьных сяброў даводзіў, што выпіваць не толькі можна, але і... трэба, прычым абавязкова. Тады, маўляў, будзеш здаровым і камунікабельным, займееш болей сяброў і сябровак...

У апошнія дні свайго жыцця (дакладней сказаць — гібення!) якое доўжылася ўсяго 37 гадоў, яму трызніліся цыганы і агонь.

Яшчэ адзін лёс. Пасля школы хлапчук уладкаваўся працаваць на спіртзавод. Кіраўніцтва яго вельмі шмат што рабіла, каб прадукцыя не раскрадалася. Але ж не дарэмна кажуць, што ад свайго злодзея нічога не схаваеш. Да канца рабочага дня цвярозых на вытворчасці амаль не заставалася. Асобныя работнікі па дарозе дамоў трымаліся за платы. Спірт (той хлопец мне сам расказваў) пачынаў здавацца смачным, нават салодкім.

На шчасце, знайшоўся разумны чалавек, які сказаў яго бацькам: «Пакуль не позна, забірайце сына з завода, а то сап'ецца». — «Але нам трэба грошай, там — плацяць», — запярэчыў бацька.

І тады той чужы чалавек сам падшукаў для хлапца іншую работу, дзе плацілі не меней. І тым самым паспеў — вырваў з абдымкаў зялёнага змея.

...Часам дзіву даешся, наколькі яны, гэтыя абдымкі, бываюць моцныя.

Зімовым ранкам на лаўцы ў скверыку каля Беларускага вакзала Масквы сядзеў збіты, абарваны мужчына і горка плакаў. Ён (зноў жа сам расказваў) развітваўся з жыццём і ўспамінаў, як добра ўсё пачыналася!

Вось ён пасля службы ў войску ўладкаваўся на работу — засяліўся ў маладзёжны інтэрнат, вось на яго вясёлага і такога прыгожага ва ўсе вочы глядзяць дзяўчаты, вось ён выбірае найлепшую... Вяселле, нараджэнне дзяцей, ключы ад першай, хай цеснаватай кватэры... У яго вельмі шмат што было: любімая справа, каханая жанчына, сям'я, аўтарытэт, добрыя грошы (зноў?!). Ну як было... частку, палову, усё (!) не прапіць?

Пачынаў і праўда з чаркі ды часткі зарплаты, потым стаў прыкладацца ледзь не штодня. На рабоце і дома (ну як жа — «залатыя рукі», бацька, гаспадар!), гэта доўга цярпелі: угаворвалі, папярэджвалі, пазбаўлялі прэмій, а потым...

Чаканы фінал: застаўся без работы і без сям'і, прыйшлося разменьваць кватэру.

З грашыма выручалі так званыя шабашкі: на шматлікія будоўлі Масквы патрабаваліся рабочыя, тым больш — спецыялісты. Можна было ездзіць на вахты і досыць бязбедна жыць. Але...

У той раз іх брыгаду, што называецца, кінулі: заплацілі куды менш, чым абяцалі.

Гэтую крыўду-бяду рабочым трэ было — ну вядома ж! — заліць гарэлкай.

Колькі яе выпілі, з кім паспрачаліся-пабіліся, хто забраў апошнія грошы і дакументы, чалавек не помніў.

...Слёзы яго заўважыла маладая жанчына: падышла, спытала, што здарылася, хто ён, адкуль — завяла ў аддзяленне паліцыі.

Сама з дапамогай сацыяльных сетак хутка знайшла яго сям'ю ў Беларусі (прозвішча ў іх досыць рэдкае)... Сын з нявесткай паднялі радню, апыталі, хай далёкага, але ж сваяка ў Маскве, які забраў гаротніка з паліцыі, пасадзіў у машыну і давёз амаль да Смаленска.

Тут ужо іншы сваяк, з тутэйшых, падабраў і даставіў дадому.

Дзеці дапамаглі грашыма, купілі патрэбныя лекі і рэчы, пры жаданні, папраўшы здароўе, ён мог бы знайсці работу і жыць... Піць хацелася болей.

...Страшная штука гэта залежнасць. Яшчэ і тым, што людзі яе не баяцца. Ну сапраўды: змалку мы гаворым сваім дзецям, што трэба асцерагацца агню, шумнай дарогі, машын, сабак, вады... І самі, як правіла, паказваем прыклады акуратнага абыходжання з імі.

З гарэлкай, з віном не так: яны ў нас з'яўляюцца на стале з нагоды і без. Многія бацькі самі наліваюць дзецям тую першую чарку — піва альбо віна, нечага мацнейшага. Хай, маўляў, пакаштуе, гарэлка смачная.

Слёзы потым вельмі і вельмі горкія.

**Мікалай Раманаў,**
*г. Магілёў.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

5 чэрвеня 2024 г. № 21 (754)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## Наталля КАЧАНАВА:

# «МЫ ГАНАРЫМСЯ СУПРАЦОЎНІЦТВАМ З ВЯЛІКІМ КІТАЕМ»






**АФІЦЫЙНЫ візіт парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай у Кітай стаў гістарычным. Першы за доўгі час, ён акрэсліў новыя кірункі ўдасканалення беларуска-кітайскіх адносін. Пра выніки візіту журналістам распавяла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. Спікер падзялілася сваімі ўражаннямі ад Кітая, дэталёва расказала пра дамоўленасці, якія былі дасягнуты, і паразважала, як далей будуць развівацца двухбаковыя адносіны. Размова атрымался не «для птушачкі», а для таго, каб зразумець, чаму афіцыйны візіт парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Кітайскую Народную Рэспубліку стаў знакавым.**

«Усе сустрэчы, якія прайшлі падчас гэтага візіту, дазваляюць нам яшчэ раз паглядзець, прааналізаваць тое, што было зроблена раней у нашым супрацоўніцтве. І яны далі магчымасць вызначыць пункты росту, новых кірункі ў нашым супрацоўніцтве для таго, каб тэрытарыяльна далёкі Кітай і ў перспектыве быў такім жа блізкім, як сёння. Як сказаў Прэзідэнт нашай краіны: для Беларусі Кітай заўсёды быў, ёсць і будзе надзейным партнёрам», — адзначыла Наталля Качанава. У якіх менавіта сферах вызначаныя пункты росту, спікер адкрыта распавяла журналістам.

### Эканоміка. Поспех відавочны

Эфектыўнасць адносін паміж дзвюма краінамі ацэньваецца ў лічбах таваразвароту. У 2023 годзе гэты паказчык склаў больш як 8 мільярдаў долараў. А ў цэлым за час двухбаковага супрацоўніцтва ён вырас больш як у 200 разоў. «То-бок, бачым, што мы працуем дастаткова шчыльна з Кітайскай Народнай Рэспублікай, але яшчэ пункты росту ў нас ёсць», — заўважыла Наталля Качанава.

Журналісты пацікавіліся меркаваннем Старшыні Савета Рэспублікі наконт таго, што беларускі бок яшчэ можа прапанаваць кітайскім партнёрам для павышэння таваразвароту. «У прыватнасці, мы абмяркоўвалі пытанні пастаўкі не толькі прадуктаў харчавання і калійных угнаенняў, якія традыцыйна пастаўляюцца ў КНР, але і, напрыклад, беларускага льновалакна», — заўважыла Наталля Качанава. У склад дэлегацыі ўвайшлі прадстаўнікі прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, якія правялі шэраг сустрэч з кітайскімі калегамі. «Зацікаўленасць у нашай сыравіне высокая, наша льновалакно вельмі запатрабавана. Нядаўна гэта пытанне мы абмяркоўвалі і на пасяджэнні ўрада: чаму не пашырыць пасевы лёну?» — задала рытарычнае пытанне Старшыня.

Перспектыўным кірункам супрацоўніцтва, па словах Наталлі Качанавай, бачыцца стварэнне сумесных прадпрыемстваў, уключэнне ў работу прыватнага бізнесу, малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Прадугледжваецца будаўніцтва завода па выпуску марожанага ў Кітаі. Цудоўным прыкладам развіцця эканамічных адносін паміж дзвюма краінамі Старшыня Савета Рэспублікі назвала Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», дзе ўжо 133 рэзідэнты на сёння.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Меліярацыя і работа са зваротамі грамадзян

### Пытанні, якія стаяць на парадку дня ў сенатараў

7 чэрвеня Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у г. Полацку.

***

Сёння ў Любанскім раённым выканаўчым камітэце пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі Качанавай адбудзецца пасяджэнне экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання. Яго тэма — «Аб практыцы прымянення заканадаўства і рэалізацыі мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель і іх эфектыўнага выкарыстання». Сярод удзельнікаў пасяджэння — члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кіраўніцтва абласных і Любанскага раённага выканаўчых камітэтаў, абласных, раённага і сельскіх Саветаў дэпутатаў Любанскага раёна, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама абласных меліярацыйных і лесагаспадарчых аб'яднанняў, землеўпарадкавальных аб'яднанняў, іншых арганізацый.

Удзельнікі пасяджэння плануюць абмеркаваць:

— меры, што прымаюцца па выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы па пытаннях меліярацыі зямель;

— ход рэалізацыі праграмных мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель сельскагаспадарчага прызначэння;

— перспектывы ўцягвання ў гаспадарчы абарот зямель сельскагаспадарчага прызначэння, занятых драўняна-хмызняковай расліннасцю;

— іншыя актуальныя пытанні прымянення заканадаўства і рэалізацыі мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель і іх эфектыўнага выкарыстання.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід ЗАЯЦ,** Прэзідэнтам нашай краіны пастаўлена задача навесці парадак на зямлі. Адным з такіх варыянтаў, па яго словах, з'яўляецца меліярацыя зямель. «Дзякуючы падтрымцы дзяржавы, нам удалося тэхнічна ўмацаваць меліярацыйны комплекс: за 2022—2023 гады мы набылі звыш тысячы адзінак нашай айчыннай тэхнікі, — паведаміў ён. — Дадаткова ў прадпрыемствы меліярацыі працаўладкавана 520 чалавек, з якіх 250 — механізатары. Мы стварылі, па вялікім рахунку, такую магутную базу для таго, каб забяспечыць ход выканання ўсіх меліярацыйных работ і ўвод гэтых зямель у сельскагаспадарчы абарот. За гэтую пяцігодку мы ўвядзём у 2-2,5 раза больш зямель, чым гэта было ў папярэднюю пяцігодку».

Па папярэдніх разліках, 753 тысячы гектараў зямлі, якая знаходзіцца пад кустамі і лясамі, 138 тысяч гектараў можна ўвесці ў сельгасабарот. «Гэта землі, якія маюць высокі балітэт, у якія можна ўкладваць грошы і атрымліваць аддачу, — заўважыў сенатар. — Тую частку зямлі, якая засталася, неабходна перадаць новаму ўласніку — у лясфонд. У выніку гэтай работы, якую мы плануем з 2026 да 2030 года, мы павінны разабрацца з зямлёй, якая знаходзіцца пад драўняна-хмызняковай расліннасцю. Вызначыць яе прызначэнне, гаспадара, выкарыстоўваць у лясным фондзе, у сельскай гаспадарцы для таго, каб гэтыя землі былі пад наглядам дзяржавы і давалі аддачу».

**Вераніка КАНЮТА.**

# «МЫ ГАНАРЫМСЯ СУПРАЦОЎНІЦТВАМ З ВЯЛІКІМ КІТАЕМ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

2024 год вызначаны як Год навукі, тэхналогій і інавацый Беларусі і Кітая. У гэтай сферы знойдзены новыя пункты росту. «У год, які вызначаны як Год навукі, тэхналогій і інавацый, для нас вельмі важна супрацоўніцтва па лініі высокіх тэхналогій — біятэхналогій, у сістэме аховы здароўя, у фармацэўтычнай прамысловасці. Акрамя таго, радыёэлектроніка, лічбавізацыя і ўсё астатняе, што вызначае сёння інавацыйнае развіццё любой краіны», — адзначыла Наталля Качанава.

## Ахова здароўя. Дзеля захавання жыцця

Надзвычай важнае для Беларусі пытанне закупкі кітайскай вакцыны супраць віруса папіломы чалавека. Кітайская вакцына добра сябе зарэкамендавала і неабходная для таго, каб засцерагчы беларусаў ад анкалагічных захворванняў, якія выклікае вірус папіломы чалавека. Гэта пытанне было актуалізавана падчас сустрэчы Наталлі Качанавай з актывістамі пярвічных арганізацый рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў Беларускага саюза жанчын у красавіку. «Спецыялісты-анколагі давялі факты статыстыкі: штогод наша краіна губляе каля 300 жанчын працаздольнага ўзросту з прычыны раку шыйкі маткі (а гэта найбольш частае сярод жанчын анкалагічнае захворванне). Таму тэма вакцынавання ад ВПЧ для нас вельмі актуальная. У Кітаі ёсць два вытворцы вакцыны ад ВПЧ. Цяпер з імі ўсталёўваюцца прамыя кантакты для вырашэння пытанняў аб магчымасці пастаўкі канкрэтных аб'ёмаў, аб тэрмінах пастаўкі і цэнах на вакцыны», — распавяла Наталля Качанава.

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, беларускім медыкам варта больш цесна супрацоўнічаць з кітайскімі калегамі нават па пратаколах лячэння. Яна звярнула ўвагу на неабходнасць адпраўляць у Кітай на стажыроўку беларускіх медыкаў. «Узаемадзеянне з Кітаем ажыццяўляецца па больш як 10 найважнейшых кірунках у медыцыне. Размова ідзе аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта з Міністэрствам камерцыі Кітайскай Народнай Рэспублікі па аснашчэнні арганізацый аховы здароўя Беларусі медыцынскім абсталяваннем, па пастаўцы ў нашу краіну высокатэхналагічнага медыцынскага абсталявання і лекавых сродкаў кітайскай вытворчасці, аб стварэнні сумеснага фармацэўтычнага кластара для рэалізацыі высокатэхналагічных праектаў у галіне медыцыны, фармацэўтыкі і традыцыйнай кітайскай медыцыны, аб фінансаванні будаўніцтва ў Беларусі бальніц пад ключ, аб супрацоўніцтве ў галіне традыцыйнай кітайскай медыцыны і сферы вышэйшай адукацыі», — пералічыла Наталля Качанава.

У склад беларускай дэлегацыі ўваходзіў і міністр аховы здароўя Аляксандр Хаджаеў, які падчас візіту правёў шэраг сустрэч з кітайскімі калегамі. І, што важна, як адзначыла Наталля Качанава, усе ініцыятывы і прапановы беларускага боку кітайскія калегі неадкладна ўзялі ў работу.

## Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Сімвал сяброўства

У час візіту акцэнт быў зроблены і на супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі. Кітай — вялізная краіна з вялікай колькасцю насельніцтва. І, па словах Наталлі Качанавай, Савет Рэспублікі як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва надзвычай зацікаўлены ў супрацоўніцтве з кітайскімі рэгіёнамі. «На сёння падпісана больш за 100 пагадненняў паміж правінцыямі Кітая і абласцямі і гарадамі Беларусі, але ж гэта яшчэ не мяжа. Мы тут павінны больш актыўна працаваць. Акцэнт быў зроблены на тым, што ў рэгіянальным супрацоўніцтве павінны больш актыўна выступаць кіраўнікі мясцовай вертыкалі, прадпрыемстваў, арганізацый, міністэрстваў, ведамстваў», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.





Выдатны ўзор міжрэгіянальнага супрацоўніцтва — Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Беларускі бок выступіў з ініцыятывай аб правядзенні і форуму рэгіёнаў Беларусі і Кітая. Па словах Наталлі Качанавай, тэма міжрэгіянальнага супрацоўніцтва праходзіць чырвонай лініяй і ў рабоце беларускіх парламентарыяў і іх кітайскіх калег.

«Гэта нават не ініцыятыва сённяшняга дня — аб гэтым гаварыў наш Прэзідэнт, такая задача ім была пастаўлена. Мы яшчэ раз гэта агучылі і пацвердзілі гатоўнасць правядзення такога форуму. І ўжо пачынаем прапрацоўваць гэтае пытанне. Думаю, хутка мы падрыхтуем прапановы для кітайскага боку — для таго, каб абгаварыць фармат правядзення



гэтага форуму. Мне бачыцца гэта добрай формай супрацоўніцтва: калі ў больш канцэнтраваным выглядзе мы бачым патэнцыял нашых краін, а на пляцоўках форуму падпісваецца дастаткова шмат кантрактаў і пагадненняў, якія ў далейшым рэалізуюцца для супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава назвала міжрэгіянальнае супрацоўніцтва вельмі перспектыўным кірункам, работа па якім ужо вядзецца досыць плённа. Напрыклад, днямі ў Брэсце знаходзілася дэлегацыя правінцыі Ляанін. Губернатар Народнага ўрада правінцыі Лі Лэчэн правёў перагаворы са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Юрыем Шулейкам.

«Мы ганарымся супрацоўніцтвам з вялікім Кітаем. Гэтая вялікая краіна, на мой погляд, унікальная тым, што там захоўваюць свае традыцыі, жывуць па сваіх законах, развіваюцца ў інтарэсах свайго народа. А самае галоўнае — умеюць сябраваць з тымі, хто таксама развіваецца менавіта так, робячы ўсё для сваёй краіны і свайго народа», — падсумавала Старшыня Савета Рэспублікі.

## Мяккая жаночая сіла. Найлепшая «зброя» ў наш час

Беларуская дэлегацыя ў Пекіне сустракалася са старшынёй Усекітайскай федэрацыі жанчын Шэнь Іцынь. Наталля Качанава падкрэсліла, што сёння жаночым арганізацыям Беларусі і Кітая трэба больш актыўна працаваць над умацаваннем рэгіянальнага і галіновага супрацоўніцтва. Старшыня Савета Рэспублікі запрасіла ў Беларусь старшыню і актывістак Усекітайскай федэрацыі жанчын. Ужо ёсць добрыя напрацоўкі для сумеснай работы. У 2022 годзе быў падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Беларускім саюзам жанчын і Усекітайскай федэрацыяй жанчын. У развіццё гэтага дакумента плануецца падпісаць адпаведную дарожную карту. Яшчэ адна ініцыятыва ад беларускага боку — стварэнне Савета жанчын пад кіраўніцтвам старшынь Савета Рэспублікі і Усекітайскай федэрацыі жанчын з мэтай кантролю і прасоўвання тых ініцыятыў і задач, якія пастаўлены кіраўнікамі краін, — у частцы жаночага парадку дня, супрацоўніцтва па лініі моладзі, захавання сямейных каштоўнасцяў.

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што сёння гэта надзвычай важная тэма. «Мы жывём у складаны час. Свет праходзіць сур'ёзныя выпрабаванні на трываласць. Узмацняецца канфрантацыя культур і цывілізацый, абвастраецца рыторыка ў міжнародных адносінах, нагнятаецца агрэсія ў інфармацыйнай прасторы, ствараюцца рэальныя пагрозы распаўсюджвання радыкалізму і экстрэмізму. І самае страшнае — губляюцца добрыя чалавечыя сувязі, заснаваныя на любові, даверы і павазе, сціраюцца этычныя межы норм паводзін. Упэўнена, што глабальная місія жанчыны якраз у тым і заключаецца, каб не дапускаць канфліктаў, прымiраць краіны і народы, настаўляць на шлях стварэння і развіцця. Сучасны свет як ніколі мае патрэбу ў такіх жанчынах — дыпламатах-міратворцах. Мне бачыцца, што жанчыны Беларусі і Кітая, з уласцівай ім маральнай чысцінёй, духоўнай асвечанасцю, глыбокай патрыятычнасцю, здольныя зрабіць значны ўнёсак у рэалізацыю гэтай вялікай місіі. Аб'яднаўшыся, жанчыны добрай волі могуць шмат. Мы разам, дзе б ні былі і чым бы ні займаліся — палітыкай, грамадскімі ініцыятывамі, хатняй гаспадаркай, — павінны ўстаць на абарону міру, бяспекі, упэўненасці ў заўтрашнім дні», — сказала Наталля Качанава. Тым больш што, па яе словах, аб'яднацца жанчынам Беларусі і Кітая нескладана. «Я ўбачыла абсалютнае падабенства нашых краін перш за ўсё ва ўнутранай палітыцы. Там таксама ў аснове дзяржаўнай палітыкі — людзі і павышэнне іх дабрабыту. Дакладна такая ж палітыка праводзіцца і ў нашай краіне: павышэнне дабрабыту насельніцтва ў прыярытэце і ў Кітая, і ў Беларусі. Жанчыны аб'ядноўваюцца ў імкненні зрабіць свет лепшым, а самае галоўнае — бяспечным і мірным», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. Па яе словах, такога ж пункту погляду прытрымліваюцца і кітайскія жанчыны. Бо жанчына, якой бы нацыянальнасці ні была, — маці, якая будзе рабіць усё магчымае, каб абараніць сваіх дзяцей. «Нашы народы сёння браты, а нашы жанчыны — сёстры», — рэзюмавала Наталля Качанава.

## Абмен досведам. З мэтай самаўдасканалення

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка неаднаразова казаў, што ў кітайскага народа варта навучыцца адказнасці і дысцыпліне. Сваімі назіраннямі наконт таго, чаму беларусам варта павучыцца ў кітайскіх калег, падзялілася і Наталля Качанава. «Мяне парадавала дысцыпліна, парадак, шанаванне сваіх сімвалаў, традыцый з боку кітайскага народа», — сказала яна. Па словах Наталлі Качанавай, яе асабліва ўразіла, як у гарачае надвор'е людзі стаяць у вялікіх чэргах, каб прыйсці на галоўную плошчу, убачыць, як падымаюць сцяг, і разам праспяваць гімн. Яна заўважыла, што кітайцы вельмі цёпла сустракалі беларусаў. «Там я ўбачыла, з якім шанаваннем людзі ставяцца да сваёй краіны. Нельга сказаць, што ў нас гэтага няма, — вядома, ёсць, людзі ганарацца сваёй краінай. Але нашым людзям яшчэ трэба павучыцца па-добраму ставіцца адзін да аднаго, паважаць уладу — тое, чаго нам часам не хапае», — лічыць Наталля Качанава. Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, варта пераймаць досвед, які дае станоўчыя вынікі. «Няма мяжы дасканаласці», — рэзюмавала яна.

## Замест заключэння. Мы ўсе робім адну справу

Журналісты звярнулі ўвагу, што некаторыя «аналітыкі» ўжо абвінавачваюць Савет Рэспублікі ва ўмешванні ў сферу дзейнасці МЗС ці канкурэнцыі з Палатай прадстаўнікоў у наладжванні міжнародных зносін. Наталля Качанава назвала такія заявы абсурдам. «Мы ўсе робім адну справу. Працуем разам, каб наша краіна развівалася эфектыўна, супрацоўнічала і сябравала з усімі краінамі, якія добра ставяцца да нашай дзяржавы і нашага народа. І калі нашы нядобразычліўцы выказваюць нечым незадаволенасць, гэта значыць, што мы робім усё правільна. Што б яны сёння ні казалі і ні рабілі, усё гэта накіравана на тое, каб дыскрэдытаваць нашу краіну. Насамрэч, мы праводзім у сваёй краіне дакладную, вывераную палітыку, нягледзячы ні на якіх зласліўцаў, — сказала Наталля Качанава. — У нашай краіне заўсёды так было, так ёсць і так будзе: усе мы працуем разам. І эканамічны блок — урад, і заканадаўчы — Нацыянальны сход». Наталля Качанава зрабіла акцэнт на тым, што ў Камітэце высокага ўзроўню па супрацоўніцтве з парламентарыямі Беларусі і Кітая прадстаўлены як кіраўнікі Савета Рэспублікі, так і Палаты прадстаўнікоў.

«Мы не звярталі і не будзем звяртаць увагу на зласліўцаў. Мы працавалі і будзем працаваць на карысць краіны і народа», — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ДЭПУТАТЫ ВУЧАЦЦА

# ВОПЫТ З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

**НА мінулым тыдні майстар-клас па тэме «Арганізацыя дзейнасці органаў мясцовага самакіравання ў сучасных умовах» давала Крычаўшчына. Менавіта яна стала пляцоўкай для выязнога семінара.**



Удзел у ім прынялі старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Гарошкін, старшыні раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў Крычаўскага, Клімавіцкага, Краснапольскага, Касцюковіцкага, Чэрыкаўскага, Хоцімскага і Шклоўскага раёнаў, прадстаўнікі самакіравання Крычаўскага раёна.

На прыкладзе аграгарадка Бацвінаўка было прадэманстравана, як тут працуюць з грамадскімі ініцыятывамі. Дэпутаты прынялі ўдзел у адкрыцці дзіцячай пляцоўкі, наведалі сярэднюю школу, пабывалі на возеры Бацвінаўка, дзе пра ролю мясцовага кіравання і самакіравання ў стварэнні працоўных месцаў і ўмоў для адпачынку расказаў мясцовы прадпрымальнік Сяргей Рагоўскі, завіталі ў вёску Нізкі, дзе разам з жыхарамі зроблена каплічка і купель, і далучыліся да богаслужэння з нагоды яе асвячэння. Усе гэтыя аб'екты ў Бацвінаўскім сельсавеце з'явіліся дзякуючы неабыякавым людзям, якія па-сапраўднаму любяць сваю Радзіму і робяць для яе ўсё магчымае.

— Адна справа — патрабаваць грошы, зусім іншая — агучыць ідэю і прыняць удзел у яе рэалізацыі, — заўважыла **старшыня Крычаўскага райсавета Ірына ПРУДНІКАВА.** — Такія семінары вельмі важныя для атрымання ведаў і распаўсюджвання свайго вопыту. Абменьвацца досведам вельмі важна.

У Крычаве ўдзельнікі ўсклалі кветкі на алеі Памяці ў Парку Перамогі, якая створана за кошт дабрачынных узносаў жыхароў і спонсарскай дапамогі. Падчас наведвання жамчужыны Крычаўшчыны, палаца Пацёмкіна — раённага гістарычнага музея, дэпутаты даведаліся пра дзейнасць Маладзёжнага парламента. Яго кіраўнік, дырэктар музея Уладзімір Мішчанка, расказаў пра тое, як грамадзянскія ініцыятывы дапамагаюць фарміраваць актыўную жыццёвую пазіцыю і ўдзельнічаць у развіцці раёна. На пленарным пасяджэнні, якое прайшло на базе музея, былі заслуханы даклады пра сучасныя падыходы ў інфармацыйна-тлумачальнай рабоце з насельніцтвам і важнасць грамадзянскіх ініцыятыў у развіцці сельскіх тэрыторый. Дэпутаты падсумавалі вынікі семінара і намецілі новыя планы.

Наступны семінар пад старшынствам кіраўніка абласвета Аляксандра Гарошкіна адбудзецца ў Шклоўскім раёне ўжо на гэтым тыдні. Тэма ўсё тая ж — «Арганізацыя дзейнасці органаў мясцовага самакіравання ў сучасных умовах». У семінары прымуць удзел кіраўнікі раённых і сельскіх Саветаў Шклоўскага, Горацкага, Дрыбінскага, Мсціслаўскага, Круглянскага, Слаўгарадскага раёнаў. Праграма будзе не менш цікавая і насычаная. Удзельнікі наведаюць тры сельсаветы — Гарадзішчанскі, Славенскі і Гарадзецкі, разгледзяць шэраг жыццёва важных для развіцця сельскіх тэрыторый пытанняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з сайта krichev.gov.by**

СУБОТНІК

# ПРАЦА, ЯКАЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ

## Дэпутаты ўсіх узроўняў на чале з сенатарам Ігарам БРЫЛЕВІЧАМ правялі экалагічную акцыю па добраўпарадкаванні тэрыторыі каля паўднёвых варот Брэсцкай крэпасці

**НАСАМРЭЧ тэрыторыя Брэсцкай крэпасці нашмат большая за той участак, на якім знаходзіцца знакаміты на ўвесь свет мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Зразумела, што тэрыторыя мае патрэбу ў пастаянным добраўпарадкаванні. Гэту работу выконваюць камунальныя службы. Але ж тут заўсёды ёсць дзе прыкласці рукі неравнадушным грамадзянам, таму перыядычна ў розных кутках крэпасці праходзяць суботнікі, працоўныя акцыі па навядзенні парадку.**



Вось і ў мінулую суботу на ўчастак каля паўднёвых варот Брэсцкай крэпасці, які суседнічае з тэрыторыяй жаночага манастыра, прыйшлі дэпутаты Брэсцкага абласнога Савета, прыехалі старшыні раённых і гарадскіх Саветаў, да акцыі далучыліся дэпутаты парламента і сенатары.

Старшыня Брэсцкага абласнога Савета Ігар Брылевіч адзначыў, што работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі, якая прылягае да мемарыяльнага комплексу, праводзяцца на сістэмнай аснове:

— У самой крэпасці, як вядома, поўным ходам ідзе будаўніцтва патрыятычнага цэнтра, ужо восенню будзе здадзена яго першая чарга. Усё гэта робіцца для нашай моладзі, школьнікаў — для падрастаючага пакалення. Сёння якраз мы адзначаем Дзень абароны дзяцей (1 чэрвеня. — **Аўт.**). І з адчуваннем, што нашым дзецям мы павінны перадаць найважнейшы гістарычны аб'ект у належным стане, мы вырашылі папрацаваць. Мы — гэта дэпутаты пярвічнага, раённага, абласнога ўзроўню. Нас падтрымалі дэпутаты абедзвюх палат парламента. На працоўную акцыю выйшлі таксама прадстаўнікі абласнога Маладзёжнага парламента. Нас аб'ядноўвае пераемнасць. З асяродка маладых людзей мы рыхтуем сабе змену, з імі мы павінны працаваць у цеснай звязцы па вырашэнні ўсіх пытанняў грамадска-палітычнага жыцця, сацыяльна-эканамічнага развіцця і для ўпрыгажэння малой радзімы.

Людзей наогул аб'ядноўвае стваральная праца. Аднадумцамі лягчэй становяцца, калі нешта робіць разам, дадаў парламентарый. «Вось і старшыні раённых Саветаў выказалі жаданне далучыцца да нашай акцыі. Па выніках выбарнай кампаніі ў нас адбылося істотнае змяненне ў шэрагу старшынь райсаветаў. Ім важна пазнаёміцца. Як вядома, нішто так не паспрыяе стасункам у добрай нефармальнай абстаноўцы, як сумесная праца на карысць Радзімы», — падсумаваў Ігар Максімавіч.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны Андрэй КРУПЕНЬКІН** сказаў, што адразу прыняў рашэнне далучыцца да працоўнай акцыі, як толькі даведаўся аб яе правядзенні:

— Брэсцкая крэпасць — асаблівы аб'ект для кожнага грамадзяніна нашай краіны. Нават пабываць тут на экскурсіі азначае дакрануцца душой да найвялікшага подзвігу яе абаронцаў і ўсяго нашага народа, які перамог у Вялікай Айчыннай вайне. Лічу за гонар прыняць удзел у добраўпарадкаванні тэрыторыі найважнейшага аб'екта гістарычнай памяці, гісторыка-культурнай спадчыны, патрыятычнага выхавання. Думаю, мы з калегамі яшчэ не раз прыйдзем у крэпасць менавіта з працоўнай місіяй. Буду рады сустрэцца на падобных суботніках са сваімі выбаршчыкамі, прадстаўнікамі маладога пакалення, якія аб'яднаны ў маладзёжныя парламенты і іншыя грамадскія арганізацыі, проста з неравнадушнымі людзьмі.

**Уладзімір ХВАЦІК, старшыня Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў,** сказаў, што ён рады сустрэцца з калегамі не толькі ў зале пасяджэнняў, як звычайна бывае, але і на рабочай пляцоўцы:

— Як ужо сказаў Ігар Максімавіч, сёння цудоўная магчымасць пазнаёміцца ў нефармальнай абстаноўцы, а яшчэ паказаць прыклад стваральнай працы нашым выбаршчыкам усіх узроўняў. Старшыні райсаветаў пастаянна працуюць на месцах, мы ім дапамагаем і кантралюем працэс добраўпарадкавання тэрыторый сваіх гарадоў і раёнаў. Фактычна ў кожным сельсавеце праходзяць суботнікі і працоўныя акцыі. А заклікаць да падобнай работы мае маральнае права той, хто і сам не цураецца працы, можа ўзяць рабочыя рукавіцы ды прыбраць умоўны квадратны метр роднай зямлі. Бачу, як старанна працуюць мае калегі, і думаю, што ў нас усё атрымаецца ў плане забеспячэння годных умоў пражывання на нашых тэрыторыях.

**Старшыня Маладзёжнага парламента пры Брэсцкім абласным Савеце Вольга САКАЛОЎСКАЯ** сказала, што маладыя парламентарыі актыўна ўдзельнічаюць у ініцыятывах абласнога Савета дэпутатаў:

— На суботнік прыйшлі два дзясяткі маладых людзей. Да работы падключыліся актывісты з усёй вобласці. Юнакі і дзяўчаты пастаянна ўдзельнічаюць у працоўных акцыях на карысць роднай зямлі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ДОБРАЯ НАВІНА

# ЖЫВАЯ ВАДА

## У вёсцы Рубяжэвічы Стаўбцоўскага раёна пасля добраўпарадкавання ўчора ўрачыста адкрылі крыніцу

**ЧЫРВОНУЮ стужку перарэзалі старшыня Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Кацярына ПАЛЯШЧУК, начальнік раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр САРОКА, старшыня раённага Савета дэпутатаў Сяргей ШЭСЦЕЛЬ.**

Мерапрыемства наведалі таксама прадстаўнікі Рубяжэвіцкага сельвыканкама, ААТ «Рубяжэвічы», жыхары аграгарадка. Настаяцель касцёла Святога Язэпа ксёндз Уладзімір Каспарэвіч і настаяцель праваслаўнага храма Мікалая Цудатворца айцец Мікалай Куранкоў асвяцілі крыніцу.

«Усяго ў Стаўбцоўскім раёне 15 крыніц. З іх добраўпарадкаваны пяць. Найважнейшая задача, якая стаіць перад мясцовымі органамі ўлады, — забяспечыць насельніцтва якасная пітной вадой. У Стаўбцоўскім раёне павінны быць устаноўлены 20 станцый абезжалезвання. Штогод мы пракладваем новыя сеткі водаправода на працягу васьмі кіламетраў», — адзначыў старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей Шэсцель.

Дарэчы, Рубяжэвічы — вельмі маляўнічае месца, якое варта наведаць. Вёска вядомая як велічным касцёлам пачатку мінулага стагоддзя, так і сучасным праваслаўным храмам, адметнасцю якога з'яўляюцца фрэскі на фасадах — рэпрадукцыі вядомых хрысціянскіх абразоў. Гэта асаблівасць робіць царкву ўнікальнай.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ПАРК НА МЕСЦЫ ПУСТКІ

## Як у Воранаўскім раёне добраўпарадкоўваюць сельскія тэрыторыі




**Развіццё сельскіх населеных пунктаў патрабуе комплекснага падыходу. Мала проста пабудаваць жылы дом ці аб'ект інфраструктуры. Важна, каб радавала вока і навакольнае асяроддзе. Вось чаму мясцовыя ўлады строга падыходзяць да сітуацыі з аварыйнымі будынкамі, зараслымі сядзібамі і наогул з неахайнай тэрыторыяй населеных пунктаў. Воранаўскі раён — адзін з прыкладаў эфектыўнасці і перспектыўнасці такога падыходу ў Гродзенскай вобласці. Апошнім часам тут актыўна наводзіцца парадак ва ўсіх аграгарадках і вёсках.**



### Чаму ў Забалаці адбыўся выбух

Аграгарадок пачынае выклікаць цікавасць ужо пры пад'ездзе. Шыльда з назвай месціцца на агромістым валуне, які знойдзены пры распрацоўцы кар'ера. Мяркуюць, што гэта сведак ледніковага перыяду. Як паведаміла **старшыня Воранаўскага райсавета Алена ГАНЕВІЧ,** у раёне імкнуцца надаць адметнасць кожнаму аграгарадку.

Што датычыцца Забалаці, тут нават некалькі разынак. **Старшыня сельскага Савета Вераніка ВІЛЬКЕВІЧ** расказала, што летась пачалася актыўная работа па навядзенні парадку. У выніку з'явіліся дзве добраўпарадкаваныя паркавыя зоны.

Афармлены выгляд набыла ўскраіна аграгарадка, дзе раней стаяла паўразбураная хатка. Пасля таго як яе разабралі, было вырашана стварыць на гэтым месцы паркавую зону. «Каб было прыгожа і ўтульна нашым жыхарам», — падкрэсліла ў размове Вераніка Вількевіч. Дарэчы, парк закладзены ў гонар медыцынскіх работнікаў, якія мужна змагаліся з пандэміяй у ковідны перыяд. Гэту ідэю ўнёс дырэктар мясцовага КСУП «Гіркі» Тадэвуш Мушынскі. Ён расказаў, што з інфекцыяй, рызыкуючы жыццём, вялі барацьбу два яго браты і пляменнікі. Працавалі ўрачы літаральна суткамі. У знак удзячнасці ўсім медыкам і было вырашана іх заслугі адзначыць такім чынам. Цяпер на месцы неахайнай тэрыторыі з аварыйным домам радуе вока прыгожы ландшафтны куток.

З дапамогай гаспадаркі тут устанавілі архітэктурныя формы, аформілі дзіцячую пляцоўку, пасадзілі туі. Прычым не проста пасадзілі, а для лепшага захавання абгарадзілі. Акцэнтам стала прыгожая драўляная альтанка. Яна зроблена ў мясцовай гаспадарцы па ўсіх правілах збудавання, устойлівая. Тэрыторыя адразу набыла прывабны выгляд.

Усе работы праведзены за год, а бюджэт аднаўлення склаў для сельгаспрадпрыемства каля 30 тысяч рублёў.

— Гэта значная фінансавая дапамога для сельскага Савета. Такім чынам, сумеснымі намаганнямі прывіваем культуру па захаванні зялёных насаджэнняў і ствараем зону адпачынку для ўсіх катэгорый насельніцтва. З'яўленне гэтай пляцоўкі дадало пазітыву ў аграгарадку Забалаць, бо тут былі пытанні: маўляў, няма дзе прагуляцца, адпачыць. Мы гэта прадугледзелі і з дапамогай гаспадаркі зрабілі такі цудоўны куток, — патлумачыла старшыня райсавета Алена Ганевіч.

Удалы пачатак вырашылі працягваць. І ўжо праз некалькі соцень метраў перад вачыма паўстае новы ўчастак. Ён пакуль пустуе. А нядаўна тут стаяў двухпавярховы даўгабуд з 1990-х гадоў. Тады меркавалі ўзвесці клуб, але ідэя так і не была даведзена да канца. Будынак разбураўся і псаваў наваколле сваім выглядам. Сумесна з гаспадаркай было прынята рашэнне аб яго зносе. Але як? Спосаб знайшлі хутка — даўгабуд падарваць. Работу ў мінулым лістападзе правялі сапёры-вайскоўцы. Жыхары потым доўга дзяліліся ўражаннямі ад выбуху, бо пабудова была маштабнай. Па словах дырэктара Тадэвуша Мушынскага, такі знос абышоўся ў тры разы танней, чым разборка. А рэшткі камянёў вывезлі для патрэб гаспадаркі.

— Ужо ў хуткім часе гэта тэрыторыя набудзе новы выгляд, — кажа старшыня сельсавета Вераніка Вількевіч. — Будзе праведзены суботнік, пасадзім дрэвы, пасеем траву, уладкуем кветнікі. Яшчэ з'явяцца дарожкі, лаўкі і летні амфітэатр для правядзення масавых мерапрыемстваў з танцавальнай пляцоўкай. Спартыўныя трэнажоры ўжо ўстаноўлены, будзе і дзіцячая пляцоўка.

Такія захады павінны прыцягваць сюды моладзь, лічыць Алена Ганевіч. А прыкладам можна назваць самых кіраўнікоў сельскіх Саветаў. У раёне відавочная тэндэнцыя davяраць адказныя пасады маладым кадрам.

### У Гірках клапоцяцца аб парадку на зямлі

**Святлана ХШАНОЎСКАЯ, старшыня Гіркаўскага сельскага Савета,** з'яўляецца маладым кіраўніком. Яна працуе старшынёй толькі паўгода, але актыўна вядзе работу па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. А іх у сельскім Савеце пятнаццаць, прычым усе з жыхарамі, пустых вёсак няма, а вось кінутых дамоў хапае. На сёння іх налічваецца больш за сотню.



— Аблічча населеных пунктаў залежыць ад таго, як самі жыхары даглядаюць свае сядзібы і тэрыторыі вакол іх. Калі дом пустуе, вядзецца работа па пошуку спадчыннікаў, нагадваем ім аб неабходнасці наводзіць парадак на падворках, сачыць за станам дома. Ёсць паўсотні дамоў, якія ўключаны ў спіс пустых. Яны альбо выстаўляюцца на продаж, альбо зносяцца, — расказала алгарытм работы Святлана Хшаноўская.

За год на тэрыторыі сельскага Савета знеслі пяць дамоў і сем фундаментаў, спілавалі безгаспадарчы сад, адзін дом выставілі на продаж. Усе затраты па зносе, а гэта больш за 20 тысяч рублёў, узяло на сябе камунальнае прадпрыемства «Гіркі». Паралельна вядзецца добраўпарадкаванне сельскіх тэрыторый. Прыклад паказваюць мясцовыя ўлады — тэрыторыя вакол адміністрацыйнага будынка выглядае ідэальна: дарожкі, роўныя зялёныя газоны, сіметрычна пасаджаныя дэкаратыўныя кусты і расліны. Крыху далей раскінулася паркавая зона з кветнікамі і архітэктурнымі формамі. Раней, кажа старшыня сельсавета, тут была праязная дарога, а цяпер прыемны воку куток прыроды. Мяркуецца працягваць работу па паркавай зоне і надалей, бо тэрыторыя дазваляе. Усе расходы па набыцці дрэў, устаноўцы ліхтароў і інсталяцый бярэ на сябе сельгаспрадпрыемства.

### Што ў Радуні месцічаў радуе

У гарадскім пасёлку Радунь пражывае больш за дзве тысячы чалавек. Населены пункт выглядае прыгожа. «Так было не заўсёды», — заўважае **старшыня Радунскага сельскага Савета Андрэй ШЫНКОВІЧ.** Праз некаторы час пад'язджаем да шматкватэрнай забудовы на ўскрайку пасёлка.

— Мы знаходзімся на месцы былых самабудаў. Чаго тут толькі не было: і гаражы, і нейкія навесы, і крывыя хлеўчыкі... Некалькі гадоў таму мы вырашылі ўзяцца за гэты непрыглядны ўчастак. Вырашылі зрабіць тут кальцавы дарожны рух. У выніку знесена больш чым паўсотні самабудаў. Затрачана нямала сіл і сродкаў, каб добраўпарадкаваць тэрыторыю, — расказаў старшыня сельсавета.

Ён таксама падзяліўся вопытам работы з насельніцтвам. Не адразу рашэнне мясцовых улад было пазітыўна прынята жыхарамі шматпавярховак. Былі і спрэчкі, і скаргі. Але прадстаўнікі ўлады стараліся прадаставіць людзям патэнцыял гэтай тэрыторыі. Было праведзена некалькі сходаў з удзелам кіраўніцтва раёна і сельскага Савета, вялася шырокая інфармацыйная работа. У ходзе такіх кантактаў удалося даказаць перавагу новага праекта, ніхто з жыхароў не аспрэчваў сваю пазіцыю ў судзе. Цяпер тут ёсць і дзіцячая пляцоўка, і месцы адпачынку, і паркоўка. Участак азялянілі і прывялі ў парадак. Да пасадкі дрэў падключаліся і самі жыхары. Бюджэт новага праекта склаў каля 700 тысяч рублёў. Такім чынам, мясцовыя жыхары замест непрывабнага ўскрайку атрымалі прыгожую тэрыторыю вакол шматпавярховай забудовы.

А летась у гарадскім пасёлку праведзена маштабная рэканструкцыя воінскага манумента. Абеліск пастаўлены на месцы пахавання абаронцаў Радуні, якія загінулі падчас вызвалення пасёлка ў 1944 годзе. Пры дапамозе мясцовай гаспадаркі пастаўлена агароджа, адноўлены мемарыяльныя пліты. Уся тэрыторыя вакол помніка таксама добраўпарадкавана. Паблізу з'явіўся парк з архітэктурнымі формамі, у тым ліку дэкаратыўнымі лаўкамі, якія ўстаноўлены мясцовым сельгаспрадпрыемствам і прадпрымальнікамі. Спонсар падарыў амаль два дзясяткі кедраў для пасадкі.

Два гады таму тут заклалі алею, якая пастаянна папаўняецца новымі дрэўцамі. Райвыканкам выдзеліў сродкі на размяшчэнне ў парку дзіцячай гульнявой пляцоўкі.

У Воранаўскім раёне лічаць, што сёння важна мець не толькі аб'екты інфраструктуры, але і прывабны выгляд усёй тэрыторыі.

— Такі падыход і стратэгія развіцця сельскіх тэрыторый сябе апраўдвае. І трэба абавязкова падыходзіць планава, — тлумачыць старшыня райсавета Алена Ганевіч. — Мы актыўна развіваем практыку правядзення выязных раённых сесій, пасяджэнняў прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў па тэме добраўпарадкавання тэрыторый. Пры падрыхтоўцы да мерапрыемства пад кожны канкрэтны праект закладваюцца сродкі, вядзецца пошук спонсараў, падключаюцца ўсе службы, а каардынуюць работу старшыні сельскіх Саветаў.

Такі падыход, мяркуючы па выніку, таксама стаў добрым стымулам для работы па навядзенні парадку на зямлі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.642. Нумар падпісаны ў 19.30 4 чэрвеня 2024 года.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ

**17 июня 2024 года**

повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
